ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



## Лёс і любоў памочніка ляснічага



## На што здольны 3D-друк?



## Дзённік першакурсніцы: як пераджыць сесію

*ЛІЧБА ДНЯ*

### 44 дыяспары

***будуць удзельнічаць у X фестывалі нацыянальных культур у Гродне — сюды з'едуцца 900 прадстаўнікоў нацыянальных аб'яднанняў. Гэта афіцыйныя ўдзельнікі творчай праграмы фестывалю — тыя, хто стаў пераможцам конкурсных адбораў. Усяго ў дні фестывалю ў абласным цэнтры рыхтуюцца прыняць не менш за 1,5 тыс. толькі запрошаных гасцей, чакаюцца і турысты. Зараз у Гродне створаны штаб фестывалю, практычна штодня праходзяць нарады, на якіх прапрацоўваюцца ўсе арганізацыйныя моманты — пачынаючы ад пешаходнага і аўтамабільнага руху, рассялення і харчавання гасцей, завяршаючы прагонкай эпізодаў свята.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 17° |
| Віцебск | + 18° |
| Гомель | + 18° |
| Гродна | + 17° |
| Магілёў | + 17° |
| Мінск | + 17° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10020,00 | ▲ |
| Еўра | 13740,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 288,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 843,79 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 МАЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 88 (27698) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЗНІТАВАНЫЯ НА ЖЫЦЦЁ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сёння — Міжнародны дзень сям'і

## МАЛАДЫЯ ЎСЁ ПАЗНЕЙ УСТУПАЮЦЬ У ШЛЮБ,

### а беларускія мужчыны ўсё больш удзельнічаюць у хатніх справах

**Сем'і ў нашай краіне ствараюцца ў асноўным паміж грамадзянамі Беларусі. Летась на долю такіх шлюбаў прыпадала 92,9%. Сярод шлюбаў, зарэгістраваных у 2013 годзе з замежнымі грамадзянамі, большасць складалі шлюбныя саюзы з грамадзянамі з краін СНД — 76,2%, з іх з грамадзянамі Расіі — 66,1%.**

❍ ❍ ❍

Спецыялісты кажуць, што тэндэнцыі, якія назіраюцца ў апошні час, сведчаць аб умацаванні інстытута сям'і. І прыводзяць галоўны аргумент — рост нараджальнасці. У 2013 годзе большасць нованароджаных з'явілася ў зарэгістраваным шлюбе. Удзельная вага дзяцей, народжаных па-за шлюбам, склала 16,1%, у той час як у 2005 годзе доля такіх дзяцей складала 24,2%.

**Міжнародны дзень сям'і быў заснаваны Генеральнай Асамблеяй ААН у 1993 годзе.**

Варта адзначыць, што ў апошнія гады ў беларускім грамадстве ідзе пераасэнсаванне ролі мужчын у выхаванні дзяцей, вядзенні хатняй гаспадаркі. Так, па выніках шматіндыкатарнага кластарнага абследавання па ацэнцы становішча дзяцей і жанчын у Рэспубліцы Беларусь, праведзенага Белстатам ў 2012 годзе, доля дзяцей ва ўзросце 3-5 гадоў, з якімі бацькі займаліся навучальнымі або развіваючымі відамі дзейнасці, склала 68,4%. А сацыялагічнае даследаванне, праведзенае сярод студэнцкай моладзі сталіцы ў 2012 годзе, паказала, што ўдзел мужчын у хатніх справах успрымаецца як нармальная з'ява большасцю студэнтаў і студэнтак універсітэтаў. Большасць студэнтаў (86%) і студэнтак (92%) лічыць, што мужчыны могуць добра клапаціцца аб дзецях.

**На 2009 год у Беларусі сямейнымі адносінамі было звязана больш за 8 млн чалавек, або 86% насельніцтва краіны.**

Акрамя таго, беларускім заканадаўствам прадастаўляецца права бацьку знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку па доглядзе дзіцяці — у цэлым гэтае пытанне аддадзена на меркаванне самой сям'і. І статыстыка сведчыць, што з кожным годам колькасць мужчын, якія знаходзяцца ў такім адпачынку, павялічваецца. Так, у 2012 годзе ў ім знаходзілася амаль 3,6 тыс. мужчын (для параўнання: у 2010-м — 2,4 тыс.).

**Святлана БУСЬКО**

■ АПК: праблемы і рашэнні

## ПРЫНЯТЫХ МЕР НЕДАСТАТКОВА

### Не варта нарошчваць вытворчасць любой цаной. А сістэму ацэнкі вынікаў гаспадарання надышоў час змяніць

**Старшыня Рэспубліканскага аграпрамысловага Саюза «БелАПС», кіраўнік вядомага сельгаспрадпрыемства «Астрамечава» Брэсцкага раёна Аляксей СКАКУН гэтымі днямі з калегамі па саюзе актыўна абмяркоўваў актуальную для ўсёй краіны тэму павышэння эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу.**

У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» Аляксей Сцяпанавіч адзначыў:

— Нельга не заўважыць, што апошнім часам аграпрамысловы комплекс дасягнуў значных вынікаў. Дастаткова сказаць, што ў параўнанні з 2000 годам аб'ём вытворчасці збожжа вырас у два разы, удвая болей мы сталі выпускаць малака і мяса. Забяспечана нацыянальная харчовая бяспека, значна павялічыўся экспарт прадукцыі. Прыемна канстатаваць, што якасць жыцця сельскага жыхара таксама значна палепшылася — як за кошт павелічэння даходаў людзей, так і дзякуючы стварэнню ўмоў для камфортнага пражывання ў аграгарадках, развіццю ў населеных пунктах сацыяльнай і вытворчай інфраструктуры. Гэта вынік пастаяннага клопату і ўвагі кіраўніка дзяржавы да праблем працаўнікоў вёскі, работы ўрада, органаў дзяржаўнага і гаспадарчага кіравання.

Але ж сёння відавочна, што прынятых мер аказалася недастаткова. Аграрны сектар не набыў неабходнай устойлівасці. Кардынальнага паляпшэння фінансавага стану арганізацый АПК не наступіла. Не ўсё добра з кадрамі кіраўнікоў і спецыялістаў. Адток кадраў не спыняецца, а маладыя спецыялісты, якія прыбываюць па размеркаванні, адпрацоўваюць два гады і звальняюцца з галіны.

Пераўтварэнне калгасаў і саўгасаў у кааператывы і акцыянерныя таварыствы не закранула карэнных адносін уласнасці і працоўнай занятасці. Нічога не змянілася ў матывацыі працы. Гаспадаркі ва ўмовах недахопу фінансавых сродкаў сталі цалкам залежнымі ад дзяржавы.

Механізм кіравання аграпрамысловым комплексам, на наш погляд, сябе вычарпаў. Не праведзена ў жыццё найважнейшая ўстаноўка кіраўніка дзяржавы аб вытворчасці сельгаспрадукцыі не любой цаной, а на падставе зніжэння стратнасці і павышэння рэнтабельнасці. Ад гаспадарак па-ранейшаму патрабуюць нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці.

СТАР. 2

## СЛОВЫ СПАЧУВАННЯ ТУРЭЦКАМУ НАРОДУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні і перадаў словы падтрымкі прэзідэнту Турэцкай Рэспублікі Абдулаху Гюлю, родным і блізкім загінулых, а таксама пажаданні хутчэйшага выздараўлення пацярпелым у выніку аварыі на шахце ў турэцкім горадзе Сома. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Рэспубліка Беларусь гатова прыйсці на дапамогу вашай краіне і аказаць неабходнае садзейнічанне ў рэабілітацыі шахцёраў, якія пацярпелі ад гэтай катастрофы», — гаворыцца ў спачуванні.

## ПРЫНЯТЫХ МЕР НЕДАСТАТКОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Я і мае калегі лічым, што на цяперашнім этапе няма патрэбы нарошчваць вытворчасць прадукцыі любой цаной, бо гэта цягне за сабой перарасход матэрыяльна-энергетычных і фінансавых рэсурсаў. Варта павялічваць вытворчасць толькі эканамічна мэтазгодных відаў прадукцыі ў эканамічна мэтазгодных аб'ёмах. Такі падыход здольны забяспечыць умацаванне эканомікі галіны.

У сувязі з гэтым патрабуецца змяніць сістэму ацэнкі вынікаў гаспадарання сельскагаспадарчых арганізацый і рэгіёнаў. Асноўным паказчыкам варта ўстанавіць прыбытак з улікам умоў гаспадарання. Ён будзе найбольш эфектыўна характарызаваць узровень гаспадарання на зямлі, дзелавыя якасці кіраўнікоў і спецыялістаў, адпадзе патрэба накіроўваць рэсурсы на вытворчасць неэфектыўнай прадукцыі, узнікне матывацыя эфектыўна выкарыстоўваць асноўныя і абаротныя фонды, — заключыў Аляксей Скакун.

**Намеснік старшыні Рэспубліканскага аграпрамысловага саюза «БелАПС» Васіль ШУЛЯКОЎСКІ** дадаў, што названыя пытанні аграрыі краіны разгледзелі на пасяджэнні прэзідыума саюза, які праходзіў у другой палове мінулага года ў СВК «Прагрэс» Гродзенскай вобласці.

**Асноўным паказчыкам варта ўстанавіць прыбытак з улікам умоў гаспадарання. Ён будзе найбольш эфектыўна характарызаваць узровень гаспадарання на зямлі, дзелавыя якасці кіраўнікоў і спецыялістаў.**

— Па выніках былі сфармуляваны прапановы па павышэнні эфектыўнасці АПК, якія ў кастрычніку накіравалі ў Савет Міністраў краіны, — сказаў Васіль Мікалаевіч. — У пісьме ёсць канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні крэдытавання сельгасарганізацый і размеркавання сродкаў на іх падтрымку, фарміраванні закупачных цэн. Таксама мы прапануем змяніць практыку ацэнкі работы галіны і ў гэтай сувязі распрацаваць новую сістэму аплаты працы работнікаў.

Рабочая група, якая была створана распараджэннем прэм'ер-міністра краіны Міхаіла Мясніковіча, усебакова разглядала нашы прапановы. Спадзяёмся, што яны знойдуць водгук у выніковых рашэннях па АПК.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Каб помнілі...

## У памяць пра дзесяць ахвяр

**У вёсцы Малыя Сяхновічы Жабінкаўскага раёна ўрачыста адкрылі мемарыяльную дошку ў гонар дзесяці аднавяскоўцаў, якія загінулі ад рук фашыстаў перад самым вызваленнем.**

Гэтую трагічную гісторыю добра памятаюць у вёсцы. Падчас палявых работ вясной 1944 года шасцёра маладых мужчын знайшлі ў полі бомбу, якая не ўзарвалася. Земляробы вырашылі прыхаваць яе, каб потым аддаць партызанам. За гэтым заняткам іх і засталі немцы. Вораг, які цярпеў паражэнне, асабліва лютаваў. Таму расстраляць вырашылі не толькі хлопцаў, якіх палічылі за памагатых партызан, але і іх сваякоў. Не пашкадавалі нават дзяўчынак 12 і 14 гадоў. А самай старэйшай з ахвяр ішоў 72-і год.

Мемарыяльную дошку з імёнамі ўсіх бязвінных ахвяр вайны замацавалі на сцяне мясцовага краязнаўчага музея. На адкрыцці памятнага знака прысутнічаў сведка страшных падзей Мікалай Гінь. Сямігадовы хлопчык тады цудам уратаваўся, а яго бацька і старэйшая сястра загінулі.

**Яна СВЕТАВА**

■ Праекты

## «Мінск-Сіці» чакае інвестараў

**Тэрмін падачы заяў на ўдзел у конкурсе па выбары інвестара для рэалізацыі праекта «Шматфункцыянальны цэнтр» Мінск-Сіці» падоўжаны да 16 мая.**

Такое рашэнне прынята ў Мінскім гарвыканкаме з мэтай прыцягнення больш шырокага кола інвестараў.

Заявы з прыкладзенымі дакументамі прымаюцца па адрасе: 220030, Рэспубліка Беларусь, Мінск, прасп. Незалежнасці, 8, каб. 227 (кант. тэл. +375 (17) 200-20-89, 218-00-62, 218-02-97, 218-02-67) па працоўных днях з 9.00 да 12.00 і з 14.00 да 16.00. Апошні дзень прыёму заяў на ўдзел у конкурсе — 16 мая ўключна да 17.00.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Парламенцкі дзённік

# ШАНЦ НА НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

## Дэпутаты прынялі чарговы закон аб амністыі

**Амністыя чакаецца ў сувязі з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Адпаведны закон прыняла Палата прадстаўнікоў на ўчарашнім пасяджэнні. Акрамя яго, дэпутаты разгледзелі яшчэ 10 законапраектаў, што закранаюць такія сферы, як процідзеянне гандлю людзьмі, стасункі з краінамі — удзельніцамі Мытнага саюза, супрацоўніцтва нашай краіны з беларусамі, якія жывуць за мяжой...**

### РОСТ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЕ ПРАГНАЗУЕЦЦА

Як паведаміў **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ**, сёлета з месцаў зняволення па амністыі выйдуць каля 7400 чалавек, яшчэ прыкладна столькім жа зменшаць тэрмін знаходжання ў турме. «Законапраект распрацаваны Міністэрствам унутраных спраў па даручэнні Прэзідэнта, — распавёў Ігар Шуневіч, — і распаўсюджваецца на тых зняволеных асоб, што не ўяўляюць вялікай небяспекі для грамадства».

Міністр унутраных спраў падкрэсліў, што ў нашай дзяржаве заўсёды прымянялася прынцып гуманізму ў дачыненні да асоб, якія адбываюць пакаранне. «Дзяржава не толькі карае, але і дае магчымасць выправіцца», — заявіў ён.

Асаблівасць сённяшняга законапраекта аб амністыі ў тым, што пашырана катэгорыя суб'ектаў, на якіх не будзе распаўсюджвацца амністыя. Пад амністыю не трапяць асобы, што здзейснілі злачынства супраць палавой недатыкальнасці ў дачыненні да непаўналетніх. Іншыя законы аб амністыі гэтай нормы не змяшчалі.

**Сёлета з месцаў зняволення па амністыі выйдуць прыкладна 7400 чалавек, яшчэ прыкладна столькім жа зменшаць тэрмін знаходжання ў турме.**

«Мы праводзілі вывучэнне вынікаў ранейшых законаў аб амністыі, таму можам сцвярджаць, што і сённяшні законапраект не зробіць негатыўнага ўплыву на крыміногеннае становішча ў краіне, — адзначыў кіраўнік ведамства. — Амністыя традыцыйна прымяняецца толькі да людзей, якія станоўча зарэкамендавалі сябе ў месцы адбывання пакарання».

Непаўналетнія, якія трапляюць пад амністыю і не маюць бацькоў і апекуноў, у абавязковым парадку праз камісіі па справах непаўналетніх перадаюцца ў выхаваўчыя калоніі, дзіцячыя дамы, школы-інтэрнаты, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы. Ні адзін з іх, як запэўніў міністр, не застанецца на вуліцы.

**Валерый ГАЙДУКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,** заўважыў, што, як правіла, пад амністыю трапляюць людзі, асуджаныя за эканамічныя злачынствы. «Яны ўжо пакрылі шкоду, якую прычынілі людзям і дзяржаве, таму няма вялікай неабходнасці ўтрымліваць іх у месцах зняволення», — патлумачыў парламентарый.

### НЕ ЗАБЫВАЦЦА ПРА СВАІХ

Праект Закона «Аб беларусах замежжа» быў ці не самым важным на ўчарашнім пасяджэнні. Закон прыняты ў другім чытанні. **Віктар ФЕСАК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу,** паведаміў, што законапраект паступіў у Палату прадстаўнікоў летась у жніўні. «Наша рабочая група сумесна з Міністэрствам замежных спраў доўга працавала над прынятым яго ў першым чытанні, затым праца была прыпынена, — распавёў дэпутат. — Падчас падрыхтоўкі гэтага законапраекта было зроблена 30 паправак і прапаноў. Усе яны былі прыняты, і ўсе распрацоўшчыкі гэтага дакумента засталіся задаволенымі выкананай працай».

Беларусы замежжа — даволі вялікая група людзей. Па розных крыніцах, за межамі радзімы пражывае ад 3 млн да 3,5 млн беларусаў. Самая вялікая беларуская дыяспара — у Расіі. Шмат беларусаў жыве ў іншых краінах СНД, у краінах Балтыі, Польшчы. «На зямным шары больш за 20 краін свету прадстаўляюць інтарэсы беларусаў», — адзначыў парламентарый.

Вышэйзгаданы законапраект вызначае сёння ўсе асноўныя прынцыпы, мэты і задачы дзяржаўнай падтрымкі беларусаў замежжа. «Ён дапаможа нам шчыльна і прадуктыўна працаваць з суайчыннікамі ў галінах эканомікі, адукацыі, навукі, культуры, турызму, — упэўнены Віктар Фесак. — Думаю, сыны нашай зямлі, што пражываюць за межамі краіны, неабыякава ставяцца да радзімы і гатовы ёй дапамагаць. У сваю чаргу, наша дзяржава не падзяляе ўсіх беларусаў на тых, што пражываюць за мяжой, і тых, што жывуць у сваёй краіне».

Сёння Беларусь праз Міністэрства замежных спраў, Міністэрства культуры, а таксама праз Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў накіроўвае ў свае пасольствы і арганізацыі, якія аб'ядноўваюць суайчыннікаў за мяжой, беларускія падручнікі, музычныя інструменты... Акрамя гэтага, як паведаміў парламентарый, законам прадугледжваецца гуманітарны праект падтрымкі беларусаў, якія вяртаюцца на радзіму.

У законе, сярод іншага, прапісана норма, якая рэгламентуе, хто можа назваць сябе «беларусам замежжа». Гэта людзі, якія пражываюць за межамі Беларусі, продкі якіх па прамой узыходзячай лініі былі выхадцамі з яе тэрыторыі, беларусы, якія не былі на радзіме, але станоўча ставяцца да нацыянальнай культуры, займаюцца самаідэнтыфікацыяй.

### МЕСЯЦ НА РОЗДУМ

У першым чытанні Палата прадстаўнікоў прыняла праект Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб процідзеянні гандлю людзьмі». Дакумент дае новыя азначэнні тэрмінам «гандаль людзьмі» і «эксплуатацыя», а таксама прадугледжвае прадастаўленне чалавеку, які мог стаць ахвярай гандлю людзьмі або звязаным з гэтым злачынствам, 30-дзённага тэрміну на прыняцце рашэння аб звароце ў органы крымінальнага праследавання.

**Прадугледжваецца гуманітарны праект падтрымкі беларусаў, якія вяртаюцца на радзіму.**

Наша краіна з'яўляецца адным з сусветных лідараў у сферы барацьбы з гэтым злачынствам. За апошнія гады дзякуючы прынятым Міністэрствам унутраных спраў мерам маштабы міждзяржаўнага гандлю людзьмі значна зменшыліся. Пік выяўленых фактаў (усяго 129) гандлю людзьмі прыйшоўся на 2005 год. Далей сітуацыя стабілізавалася: у 2011 годзе выявілі 9 фактаў гандлю людзьмі, у 2012 — 8, у 2013 — 6. За апошнія гады супрацоўнікі МУС ліквідавалі 22 міжнародных каналы, па якіх здзяйсняўся гандаль людзьмі, і 82 арганізаваных злачынных групы, што таксама «рабілі бізнес» у гэтай сферы. За гэты перыяд, па інфармацыі міністра, устанавілі прыкладна 5 тысяч ахвяр гандлю людзьмі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Ведай нашых!

## Россып медалёў юных «зорак»

**Хлопчыкі і дзяўчаткі з узорнай студыі эстраднай песні цэнтра культуры «Віцебск» заваявалі на міжнародным фэсце TALENT SHOW шэсць прызавых месцаў. Цікава, што фестываль праходзіў на круізным караблі.**



— У гэтай культурнай акцыі, якая праводзілася чацвёрты раз, у конкурснай праграме прадстаўлены такія намінацыі, як вакал, харавыя спевы, харэаграфія, інструментальная музыка, арыгінальны жанр (цырк, тэатр, мастацкае чытанне і іншае), дызайн адзення. Сярод удзельнікаў былі і дзеці з абмежаванымі магчымасцямі. Конкурснае марское падарожжа пачалося ў Рызе, затым карабель прыйшоў у Стакгольм, а потым зноў у сталіцу Латвіі. Юныя таленты не толькі змагаліся за перамогу, але і маглі проста на караблі наведаць майстар-класы, паўдзельнічаць у забаўляльных мерапрыемствах. Дзецям надоўга запомніцца экскурсія па Рызе і Стакгольме, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў цэнтры культуры «Віцебск». А «залаты медаль» ва ўзроставай катэгорыі 8-9 гадоў выйграла Вераніка Юхнавец.

**Кіраўнік студыі эстраднай песні «Форум» Таццяна КІРЫЛАВА** адзначыла, што пасля Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», дзе калектыў будзе не раз з'яўляцца на сцэне разам з «зоркамі» эстрады, запланаваны ўдзел у новым праекце — VI Міжнародным фестывалі дзіцячай і маладзёжнай творчасці «Балтыйскі ваяж». Безумоўна, і там віцебскія дзеці выступяць вельмі ўдала!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## Кантралёры падчас чэмпіянату будуць лаяльнымі

**У перыяд правядзення чэмпіянату свету па хакеі кандуктары не будуць працаваць на маршрутах, якія праходзяць паблізу спартыўных арэн. Пра гэта падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА сказаў намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» Віктар Тозік, адказваючы на пытанне адносна гатоўнасці кандуктараў і кантралёраў грамадскага транспарту да чэмпіянату свету па хакеі.**

— Больш за тое, аўтаматызаваная сістэма кантролю аплаты праезду, якую мы укараняем у Мінску і якая цяпер працуе ў тэставым рэжыме, у прынцыпе, не прадугледжвае работу кантралёраў, — сказаў ён.

Паводле яго далейшых слоў, «кантралёры, вядома, будуць працаваць. Але не ва ўзмоцненым, а ў звычайным рэжыме. З імі праведзена растлумачальная работа, каб яны добразычліва, лаяльна ставіліся да людзей, якія будуць карыстацца транспартам, асабліва на маршрутах, што праходзяць паблізу спартыўных арэн, і каб у нас не было ніякіх канфліктных сітуацый».

Што датычыцца магчымых праблем у зносінах на розных мовах, як адказаў Віктар Тозік, «думаю, хутчэй за ўсё, іх не ўзнікне. Бо 90 працэнтаў тых, хто прыедзе ў Мінск на хакейныя матчы, будуць з Расіі і краін, дзе ведаюць рускую мову на ўзроўні, дастатковым для бытавых зносін».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВЕТЭРАНЫ ТЭЛЕФАНАВАЛІ І Ў БРАЗІЛІЮ, І Ў БАРНАУЛ

**Мабільны аператар МТС падвёў вынікі традыцыйнай сацыяльнай акцыі «Званок аднапалчаніну», падчас якой ветэраны Вялікай Айчыннай вайны маглі бясплатна патэлефанаваць у любую краіну свету і пагутарыць са сваімі аднапалчанамі, сябрамі і сваякамі.**



Часцей за ўсё ветэраны тэлефанавалі ў Расію: на сувязь з Беларуссю выходзілі Масква, Санкт-Пецярбург, Краснадар, Разань, Іванава, Белгарад, Цвер, Новасібірск, Іркуцк, Томск, Хабараўск, Волагда, Барнаул і Чалябінск. Таксама беларускія ветэраны тэлефанавалі ў Вялікабрытанію, Італію, Індыю, ва Украіну, у Літву, Латвію, Эстонію, Узбекістан, Ізраіль, ЗША і нават Бразілію.

Акцыя доўжылася з 8 па 10 мая. Сумарная працягласць размоў за тры дні склала 18 гадзін, а кожны званок доўжыўся ў сярэднім 9 хвілін. Найбольш актыўнымі аказаліся ветэраны Мінскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Пунктамі перагавораў сталі ўласныя салоны сувязі кампаніі МТС, размешчаныя ў сталіцы, абласных і раённых цэнтрах. Акрамя таго, мабільныя перагаворныя пункты былі разгорнуты ў цэнтры Мінска падчас шэсця ветэранаў, прысвечанага святкаванню Дня Перамогі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## У ДЗЕНЬ СЯМ'І — БЯСПЛАТНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ НАТАРЫУСА

**Сёння натарыусы правядуць бясплатныя кансультацыі па пытаннях заключэння шлюбных дагавораў. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства юстыцыі Беларусі.**

Акцыя будзе праводзіцца сумесна з супрацоўнікамі аддзелаў ЗАГСа і пройдзе ў натарыяльных канторах і бюро з 10 да 16 гадзін па ўсёй краіне. У Мінску натарыусы будуць кансультаваць па пытаннях заключэння шлюбных дагавораў будучых мужа і жонкі ў Доме шлюбаў Мінскага гарвыканкама (вул. Камуністычная, 8). А натарыусы Мінскай абласной натарыяльнай акругі — у памяшканні аддзела ЗАГСа Мінскага райвыканкама (вул. Альшэўскага, 8).

Шлюбны дагавор або кантракт, як правіла, заключаецца ў мэтах павышэння адказнасці мужа і жонкі адно перад адным. Такі дагавор можа заключацца перад уступленнем у шлюб, а таксама ў любы час у перыяд шлюбу.

У Мінюсце паведамілі, што шлюбным дагаворам могуць быць урэгуляваны не толькі маёмасныя адносіны паміж мужам і жонкай, але і іх узаемаадносіны, а таксама ўзаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі, у тым ліку пытанні выхавання дзяцей і іншыя.

**Святлана БУСЬКО.**

## ІНТЭРНЭТ — ПА САЦЫЯЛЬНЫМ ТАРЫФЕ

**Новы тарыфны план «Сацыяльны анлім 2» для людзей, якім патрабуецца фінансавая падтрымка, запусціў «Белтэлекам» (byfly).**

Права падключэння на яго дадзена шматдзетным сем'ям, воінам-інтэрнацыяналістам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, сем'ям, якія маюць дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 18 гадоў, дзіцячым дамам, дзіцячым дамам сямейнага тыпу, а таксама грамадскім арганізацыям, якія займаюцца праблемамі інвалідаў.

Тарыфны план прадугледжвае шырокапалосны кругласутачны доступ у інтэрнэт на хуткасці 2048/512 Кбіт/с са штомесячнай абаненцкай платай 45 тысяч рублёў. Падключыцца на яго могуць фізічныя, юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі. Пры падключэнні тарыфнага плана «Сацыяльны анлім 2» спатрэбіцца пашпарт і пасведчанне на права карыстання льготай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## МАГІЛЁЎСКАЯ МІЛІЦЫЯ ЗАГАВАРЫЛА НА ТРОХ МОВАХ

**Такім чынам да чэмпіянату свету па хакеі падрыхтаваліся навучэнцы Магілёўскага вышэйшага каледжа міліцыі. Падчас нясення службы ў горадзе яны змогуць даць даведкі замежным гасцям, дзе паснедаць, як знайсці гасцініцу і г.д адразу на трох замежных мовах — англійскай, італьянскай і нямецкай. Каб патэнцыйныя госці ведалі пра гэта, у лабараторыі вучэбнага тэлебачання ўстановы нават падрыхтавалі невялікія ролікі, якія сёння можна пераглядзець на Youtybe.**

— Гэты год праходзіць пад знакам гасціннасці, і мы павінны ўмець з кожным знаходзіць агульную мову, — адзначыў **начальнік Магілёўскага вышэйшага каледжа МУС Генадзь КАЛЕСНІК.** — Бо менавіта па тым, як сустракаюць госця, складваецца ўражанне аб горадзе і краіне.

Дарэчы, у каледжы шмат чаго робіцца для развіцця міжнародных зносін. Не так даўно дэлегацыя гэтай установы наведала Азербайджан, дзе наладзіла стасункі з калегамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

■ Мама, тата і...

Шматдзетная маці Паліна Гесць:

# «Я ЗАЎСЁДЫ БЫЛА КАР'ЕРЫСТКАЙ»

## Можна мець вялікую сям'ю і пры гэтым не страціць сябе

**Да прыпынку пад'язджае сіні легкавік, з якога выходзіць маладая, прыгожая, без грама касметыкі на твары жанчына. «Хто тут мяне чакае?» — задорна гукае яна. Разумею, што пытанне адносіцца да мяне, і рушу насустрач Паліне Гесць, маме (цяжка паверыць!) шасцярых дзяцей.**



### БЯЗМЕЖНАСЦЬ МАЦЯРЫНСКАЙ ЛЮБОВІ

«Чаго-чаго, а хуткасці ў маім жыцці шмат», — усміхаецца спадарыня Паліна і запрашае мяне ў аўтамабіль, дзе на заднім сядзенні бачу самую малодшую дзяўчынку — гадавалую Стэфанію, якую мама пакуль не можа пакінуць адну.

Шматдзетная сям'я жыве ў пасёлку Сосны пад Мінскам, і ўласны дом, які будавалі восем гадоў і куды толькі-толькі перабіраюцца, — сапраўдны гонар гаспадароў. «Я ўсё жыццё жыла ў Соснах. У горадзе я знаходзіцца не магу — хварэю», — прызнаецца жанчына.

Зранку ў доме засталіся толькі Паліна Міраславаўна ды маленькая Сцеша. Муж на працы, а астатнія дзеці разбегліся хто на вучобу, хто на трэніроўку, хто ў дзіцячы садок. Мы праходзім на кухню, дзе гаспадыня, прыгатаваўшы кашу для дачкі, пачынае яе карміць.

«Мы з мужам думалі, што нам хопіць дваіх дзяцей, — распавядае маці, пакуль маленькая з захапленнем размазвае лыжкай кашу па стале. — Але, відаць, лёс вырашыў іначай, і спыніцца на дваіх не атрымалася».

Цяпер да гэтага бацькі ставяцца па-філасофску: маўляў, калі Бог даў, значыць, усіх паднімем. «Прыйшлі б яны да мяне ўсе адначасова — напэўна, звар'яцела б. А так — паспяваю адаптавацца», — кажа жанчына. Зрэшты, старэйшыя ўжо самі пакрысе становяцца памочнікамі. Першынцу Стасу цяпер 18 гадоў. Ён вучыцца ў БНТУ. Апроч таго, займаецца тэнісам і цяпер перайшоў на

**Паліне Гесць удаецца і агонь у сямейным ачагу падтрымліваць, і рэалізоўвацца ў прафесіі, а таксама весці актыўнае грамадскае жыццё і займацца шматлікімі відамі рукадзелля.**

ўзровень судзейства, што дае хлопцу магчымасць зарабляць грошы. Увогуле ў сям'і Гесць тэнісам займаюцца чацвёра старэйшых дзяцей — на гэтым настойвае бацька. І хоць ва ўсіх розныя здольнасці да гэтага віду спорту, але затое аднолькава добрая фізічная падрыхтоўка. Вялікіх поспехаў у тэнісе дасягае другі сын Ян, якому цяпер 14. Дванаццацігадовы Трафім займаецца авіямадэліраваннем і сур'ёзна захапіўся варкаўтам — сілавымі трэніроўкамі. Ганна, якой 9 гадоў, чэмпіёнка Беларусі і свету па індыйскіх танцах сярод дзяцей. Пяцігадовую ціхмяную Глафіру спадарыня Паліна з усмешкай называе «дзіця — мамін адпачынак». Мяркуе, што Сцеша займее такі ж неспакойны характар, як старэйшая Ганна.

Усе дзеці вельмі розныя, і маці выдатна ведае характары, здольнасці і недахопы кожнага з іх. І калі раптам нехта з малечы праяўляе інтарэс да пэўнай дзейнасці, бацькі адразу імкнуцца развіваць гэту сферу: аддаюць дзяцей у гурткі, рыхтуюць тэматычныя падарункі. На маё пытанне, як удаецца не абдзяліць нікога ўвагай, жанчына адказвае: «Я заўсёды знаходжуся побач з тым, каму мая ўвага найбольш патрэбна ў гэты момант. Калі з адным трэба зрабіць урокі — іду да яго; другому пашыць касцюм да выступлення — шыю. Усе гэта разумеюць, і ніхто не адчувае сябе пакінутым». І, што адметна, мацярынскай любові ад гэтага менш не становіцца. Наадварот, са з'яўленнем новага дзіцяці яе ўсё больш.

### ШАСЦЁРА ДЗЯЦЕЙ — ГЭТА НЕ СТРАШНА

З вопыту сям'і Гесць мець шасцёра дзяцей зусім не страшна. Толькі часам «цісне» грамадскае меркаванне. «Адно дзіця — гэта абавязкова, два — малайцы, а вось з'яўленне трэцяга ў вачах грамадскасці выклікае нараканні: маўляў, як жа вы іх будзеце карміць? Калі ў нас нарадзілася чацвёртае дзіця, пытанні задаваць перасталі. Цяпер усё цікавяцца, калі будзе сёмае», — усміхаецца спадарыня Паліна.

Ёсць і такія «добразычліўцы», якія любяць папракнуць шматлікімі льготамі і дзярждапамогай. Але



сям'я Гесць — яскравы прыклад таго, як можна не «сядзець на шыі» ў дзяржавы. «Безумоўна, вельмі істотным плюсам з'яўляецца бясплатнае абавязковае харчаванне ў школе, якое для ўсіх каштуе 110 тысяч на тыдзень. Да таго ж за дзіцячы садок мы плацім 50%. Але ў астатнім мы разлічваем толькі на ўласныя сілы, бо працуем на сябе. Дарэчы, з вялікай сям'ёй лягчэй эканоміць», — дзеліцца шматдзетная маці.

**«Я заўсёды была кар'ерысткай. Але чым больш жыву, тым больш пераконваюся, што галоўнае прызначэнне жанчыны — сям'я».**

Гэта можа падацца неверагодным, але сама Паліна Гесць — з тых жанчын, каму адначасова ўдаецца і агонь сямейнага ачагу падтрымліваць, і рэалізоўвацца ў прафесіі (скончыла аспірантуру, выкладала маркетынг, і цяпер, у дэкрэце, працуе па спецыяльнасці ў кампаніі мужа), а таксама весці актыўнае грамадскае жыццё і займацца шматлікімі відамі рукадзелля. Апошняе, як і любімае хобі — чытанне, — спосаб рэлаксацыі. Спадарыня Паліна шые, вяжа, варыць мыла і хатнія касметычныя крэмы — напэўна, дзякуючы натуральнай касметыцы жанчына мае такі малады і здаровы выгляд. Дзе яна знаходзіць на ўсё гэта час — можна толькі здагадвацца, але сама гераіня кажа, што яго не хапае ніколі.

Тым не менш, паспяваць рабіць усё гэта ўдаецца дзякуючы моцнаму характару, а таксама надзейнаму мужу Ілы, пра якога спадарыня Паліна расказвае з вялікай цеплынёй. Дарэчы, пазнаёміліся будучыя муж і жонка яшчэ ў студэнцтве і ўжо 20 гадоў крочаць па жыцці разам. У абаіх было строгае выхаванне з традыцыйнымі каштоўнасцямі, але ў той жа час у іх сям'і няма падзелу на

**«Адно дзіця — гэта абавязкова, два — малайцы, а вось з'яўленне трэцяга ў вачах грамадскасці выклікае нараканні: маўляў, як жа вы іх будзеце карміць?»**

«мужчынскія» і «жаночыя» абавязкі — ва ўсім пануе ўзаемавыручка. Усё гэта бацькі імкнуцца перадаць і дзецям. Але кожны з іх — асоба са сваім светам, сваімі здольнасцямі і сваім жыццёвым шляхам. Мудрыя бацькі гэта бачаць і толькі накіроўваюць сваіх нашчадкаў, але не стараюцца іх перайначыць.

Спадарыня Паліна не лічыць шматдзетнасць гераізмам, перакананая, што гэта норма. «Я заўсёды была кар'ерысткай і марыла «адбыцца» як спецыяліст, а дзеці былі далёка не на першым месцы. Але чым больш жыву, тым больш пераконваюся ў тым, што галоўнае прызначэнне жанчыны — сям'я».

Прыклад сям'і Гесць смела можна назваць паспяховым. Хоць, безумоўна, у гэты поспех укладзена шмат намаганняў, а шлях да яго зусім не лёгкі. Але недарэмна любімым выразам маёй суразмоўцы ў апошні час стаў наступны: «Дарогу адолее той, хто ідзе». На развітанне гаспадыня прызналася, што змагла рэалізавацца ў розных сферах, і пры гэтым захоўвае прагу жыцця. «Я зразумела, што галоўнае — жыць у гармоніі з сабой. У мяне гэта атрымліваецца».

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

**Фота аўтара і з архіва сям'і Гесць.**

*Мінскі раён*

■

# НАС ЧАКАЕ ФІНЛЯНДЫЯ

## Матчы першынства свету па хакеі, што адбыліся ў аўторак, аказаліся багатымі на барацьбу і закінутыя шайбы

**Група А.** Скандынаўскае дэрбі паміж Нарвегіяй і Швецыяй на «Мінск-Арэне» наогул магло прынесці шведам першы абаранак, але «Трэ крунур» пераламалі ход сустрэчы і здолелі пакласці ў скарбонку чарговую вікторыю (2:1). Цяпер у шведаў іх тры, і ёсць выдатныя шанцы выйсці са сваёй групы.

Матч датчан супраць італьянцаў не атрымаўся інтрыгуючым. Зборная з Апенінскага паўвострава, якой яшчэ загадзя прадракалі ролю аўтсайдараў, саступіла датчанам 1:4.

У **групе В,** дзе гуляе наша нацыянальная каманда, чатыры зборныя за два матчы адзначыліся 13 закінутымі шайбамі. Лепш за ўсіх у гэтым кірунку папрацавала зборная Латвіі, якая закінула 5 шайб Казахстану. Між іншым, казахі прыбалтам не здаваліся і ў выніку саступілі толькі адну шайбу.

— Атрымалася вельмі цікавая і захапляльная гульня, — адзначыў **Ары-Пека Селін, галоўны трэнер зборнай Казахстана.** — Для перамогі мы мелі добрыя шанцы, аднак зрабілі некалькі недазвалыльных памылак. Магчыма, Латвія ў нечым была больш цярплівай за нас.

Яшчэ ў адным паядынку Германія не здолела нічога супрацьпаставіць Фінляндыі — 0:4. Дарэчы, фіны — наш бліжэйшы сапернік, з якім мы сустрэнемся сёння на «Мінск-Арэне» ў 20:45. Матч будзе цікавы і тым, што беларускія балельшчыкі зноў убачаць гульню 39-гадовага Ерэ Каралахці. Фінскі абаронца цяпер выступае на радзіме за «Ёкерыт» з Хельсінскі, а яшчэ нядаўна гуляў за сталічнае «Дынама» і быў любімчыкам публікі. Таксама ў гэты дзень ЗША скрыжуе клюшкі з Латвіяй, Канада — з Даніяй, а Францыя паспрабуе даць бой Швецыі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Шайбу на сябе прымае абаронца зборнай Казахстана Раман Саўчанка.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# «ХАКЕЙ — ГЭТА НЕ ТЭАТР»

## Сюды ходзяць падтрымаць і спрычыніцца да перамогі

**Жарсці вакол чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску ўсё нарастаюць. Пасля дзвюх перамог нашай зборнай — спачатку ў сустрэчы з Казахстанам, а затым і са Швейцарыяй — квіткі на гульні з удзелам Беларусі разляцеліся імгненна. Паралельна з тым у музеі І з'езда РСДРП адкрылася выстава пад назвай «Сектар», прысвечаная развіццю фанацкага руху ў нашай краіне.**

Фанаты футбольныя і хакейныя ў Беларусі былі заўсёды, аднак штуршком да развіцця гэтага руху стала перамога каманды «Дынама» ў 1982 годзе ў чэмпіянаце Савецкага Саюза. З таго часу нашы балельшчыкі, натхнёныя і падбадзёраныя гэтай вікторыяй, сталі актыўна падтрымліваць айчынныя клубы і нацыянальную зборную.

Вядучы навуковы супрацоўнік музея І з'езда РСДРП Андрэй Ляневіч падчас адкрыцця выставы расказаў, што сапраўдны класічны спорт — гэта найперш эмоцыі. Важныя не атрыбуты, пэўная мода і стыль, што часам суправаджаюць спартыўных балельшчыкаў, а тыя перажыванні, якія захоўваюцца на трыбунах пры падтрымцы сваёй каманды.

Андрэй Ляневіч, які сам з'яўляецца актыўным балельшчыкам, даў пэўныя парады тым, хто ніколі не быў на хакеі, але ў гэтыя майскія дні вырашыў асабіста падтрымаць сваю зборную. Па-першае, варта апранаць спартыўную кашулю той хакейнай каманды, за якую збіраецеся «хварэць». Па-другое, можна ўзяць з сабой фірменны шалік — гэта таксама будзе вылучаць вас з натоўпу і сведчыць пра тое, каму вы сімпатызуеце. Па-трэцяе, не варта браць з сабой розныя дудкі, гудзелкі і іншыя аналагічныя рэчы. Бо толькі ваш уласны голас насамрэч можа падтрымаць каманду. Ляневіч дадае:

— Можна апранацца ў колеры сваёй каманды ці прыйсці і ў звычайным выглядзе. Але галоўнае — падтрымлівайце зборную гучна, голасам. Не сядзіце, як у тэатры. Хакей — гэта не тэатр. Сюды прыходзяць падтрымаць і спрычыніцца да перамогі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## ■ Вакол чэмпіянату

### ГАЛЫ, АЧКІ, СЕКУНДЫ...

**Зборныя Расіі і Беларусі лідзіруюць па наведвальнасці пасля пяці гульнявых дзён 78-га чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.**

Тры пераможныя сустрэчы расійскіх хакеістаў на лёдзе «Мінск-Арэны» наведалі **41 358 гледачоў** (13 768 у сярэднім за гульню). На матчах гаспадароў турніру, беларусаў, пабывалі 40 541 чалавек (13 513). Усяго на 24 матчах на трыбунах «Мінск-Арэны» і «Чыжоўка-Арэны» пабывалі 218 118 балельшчыкаў. Сярэдняя наведвальнасць аднаго паядынку — 9088 гледачоў.

**Больш усё хвілін штрафу** ў пасіве зборнай Чэхіі — 57. Прычым ільвіная доля прыпадае на форварда Яна Коваржа, які з'яўляецца лідарам сярод усіх парушальнікаў зводу хакейных правілаў. Ён «зарабіў» 27 штрафных хвілін, прычым усе ў адным матчы — супраць зборнай Канады. За наўмысную грубасць супраць капітана «кляновых лістоў» Кевіна Біекса, які страціў пры гэтым зуб, Коварж атрымаў матч-штраф (20 хвілін. І яшчэ 5 + 2 хвіліны). Гэтае выдаленне каштавала чэшскай зборнай дзвюх прапушчаных шайб і выніковага паражэння з лікам 3:4.

Самымі «ўзорнымі» ў гэтым плане з'яўляюцца хакеісты зборнай Германіі, якія за тры матчы атрымалі ўсяго 16 штрафных хвілін. У зборнай Беларусі 34 хвіліны штрафу і 7-е месца сярод 16 удзельнікаў сусветнага першынства.

**Лепш за ўсіх рэалізоўвалі колькасную большасць** латвійскія хакеісты: яны закінулі 4 шайбы пры 11 розыгрышах «лішняга» гульца. У гэтай намінацыі беларусы займаюць 8-е месца — 2 галы ў 10 выпадках большасці.

**Пры гульні ў меншасці** найлепшы паказчык у далёка не самай «зорнай» італьянскай дружыны, якая не прапусціла ніводнай шайбы, 12 разоў абараняючыся супраць сапернікаў, якія мелі колькасную перавагу. Зборная Беларусі 14 разоў гуляла ў меншасці і прапусціла 4 шайбы. Затое, нават знаходзячыся ў аслабленым складзе, падапечныя Глена Хэнлана здолелі двойчы трапіць у вароты сапернікаў — пакуль гэта самы лепшы вынік.

**Самай выніковай камандай** з'яўляецца зборная Расіі, якая закінула 15 шайб у 3 праведзеных сустрэчах (у сярэднім 5 за гульню). Капітан расіян Аляксандр Авечкін узначальвае спіс лепшых бамбардзіраў ЧС, маючы 6 бамбардзірскіх балаў па сістэме гол плюс пас (3 + 3). У расіян таксама найлепшая абарона — усяго 3 прапушчаныя галы. Галкіпер расійскай каманды Сяргей Баброўскі пакуль самы непрабіўны на гэтым сусветным першынстве. У двух праведзеных паядынках ён адбіў 61 з 63 кідкоў (96,83 %). Беларускі варатар Віталь Коваль займае па гэтым паказчыку 4-е месца — у яго 47 сэйв з 51 кідка (92,16).

Форвард зборнай ЗША Томі Уінгелс **больш за ўсіх выйграваў укідванні,** перамогшы ў 6 з 9 дуэляў.

■

## ■ Вачамі балельшчыка

# «ТУТ МЫ АДЧУВАЕМ СЯБЕ СВАБОДНА»

## Латвійскіх аматараў хакея ў Мінску захапляюць роўныя дарогі, паркі і... маленькія дзеці

**Іх можна смела назваць самымі эксцэнтрычнымі, арыгінальнымі і бесшабашнымі. Тое, як госці з Прыбалтыкі «хварэюць» за сваю любімую каманду на «Мінск-Арэне», сапраўды ўражвае. Гэта заўсёды самыя гучныя «крычалкі», самыя неверагодныя касцюмы і атрыбутыка. А калі казаць пра маштабы фанацкай брацii, то латвійцам тут увогуле няма роўных. Нават калегі-журналісты з Латвіі прызнаюцца, што сёлетні чэмпіянат свету па хакеі б'е ўсе папярэднія рэкорды па колькасці «бардовых джэрсі». У многіх гэта далёка не першая паездка на буйныя спартыўныя спаборніцтвы. Але нават балельшчыкаў са стажам беларуская сталіца здзіўляе, захапляе і ўлюбляе ў сябе з першага погляду.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЭХ, ДАРОГІ!..

Гунтарс прыехаў у Мінск разам са сваёй дзяўчынай. Побач з высокім, мажным хлопцам мініяцюрная светлавалосая Ілзэ выглядае дзюймовачкай.

— На нас часта звяртаюць увагу. Асабліва калі Гунтарс бярэ з сабой на трыбуны барабан, — смяецца дзяўчына.

Гунтарс згодны з меркаваннем, што латвійскія балельшчыкі — самыя экзатычныя і заўважныя:

— Я нават сказаў бы, што мы шалёныя! Але гэта толькі ў межах «хварэння». У самыя эмацыянальныя хвіліны мы, напэўна, выглядаем крыху жахліва, але, насамрэч, латвійскія фанаты — мірныя і прыемныя людзі.

Ілзэ і Гунтарс не ўтойваюць свайго захаплення ад святочнага Мінска і кажуць адкрыта: «Абажаем ваш горад!» Асабліва іх уразілі роўныя дарогі.

— Грамадскі транспарт ці аўтамабіль — няма розніцы. Едзеш ціха, спакойна... У нас такога няма, — прызнаецца хлопец.

— Вось замёрз на трыбунах, вырашыў сагрэцца гарбатай, — усміхаецца мужчына.

— Так, гарачыя баталіі на лёдзе наўрад ці выратуюць, — адказваю выпадковаму суразмоўцу.

Мужчына ловіць мой цікаўны позірк на сваім спісаным джэрсі.

— Гэта мой чатырнаццаты чэмпіянат. І вось што я скажу: ні Расія, ні Швецыя, ні Фінляндыя не арганізоўвалі лепшага першынства свету па хакеі. Нават у параўнанні з алімпійскімі хакейнымі турнірамі ваш выйграе. Арганізацыя проста выдатная. Па ўсім відаць, што рыхтаваліся доўга і сур'ёзна. Арэны — шыкоўныя, з транспартам — ніякіх праблем, нягледзячы на пастаянны паток пасажыраў. На фан-зонах заўжды весела, атмасфера проста грандыёзная. А самае галоўнае, што ўсё гэта зроблена з душой.

### СВЯТА, ЗРОБЛЕНАЕ З ДУШОЙ

А яшчэ ў латвійскіх фанатах здзіўляе камунікабельнасць і адкрытасць. Завесці знаёмства з гаспадарамі свята ці з іншымі балельшчыкамі для іх не праблема. Яны з радасцю падзяляцца з вамі, каб падзяліцца з вамі думкамі і эмоцыямі. Так я пазнаёмілася з Айварсам — уладальнікам ювелірнай крамы з Рыгі. 54-гадовы мужчына ў бела-бардовым джэрсі са шматлікімі аўтографамі «зорак» хакея загаварыў са мной у чарзе па гарачыя напоі на «Мінск-Арэне».



### ФРЫК-ШОУ ПА-ЛАТВІЙСКУ

На кожным матчы латвійскай зборнай з'яўляецца незвычайнае трыа — крыклівыя хлопцы ў пярэстых трыко, якія весяляць публіку сваімі жартамі і розыгрышамі. У жыцці гэтыя зусім не сур'ёзныя хлопцы... эканамісты.

— Ведаеце, калі ўсё, што ты бачыш кожны дзень, — гэта лічбы, працэнты, бясконцыя найменні, часам хочацца адключыць галаву і пабыць клоўнам, — усміхаецца Марыс, хлопец у жоўтым трыко. — Гэта далёка не першыя нашы акцыі на падобных мерапрыемствах, але чамусьці менавіта ў Мінску мы адчуваем сябе надзвычай свабодна.

Марыс кажа, што ў беларускай сталіцы яго больш за ўсё ўразіла вялікая колькасць паркаў і... маленькіх дзяцей.

— Асабліва ўвечары можна заўважыць, як маладыя сем'і гуляюць са сваімі дзецьмі. Гэта вельмі крута!

Эканамісты з задаткамі шоўменаў нарасхват сярод гасцей фанзоны «Мінск-Арэны». Ад ахвотных сфатаграфавацца няма адбою. Пры гэтым хлопцы не забываюць, што перш за ўсё прыехалі глядзець хакей і падтрымліваць сваю зборную, таму замест «cheese» у самы адказны момант выкрыкваюць: «Latvia uzvara!» (Латвія перамога. — **Аўт.**).

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■

# ЧЫРВОНКА
## Чырвоная змена

15 МАЯ 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 9 (15744)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года


Імёны

Алесь КОТ-ЗАЙЦАЎ:

# «УСЯГО Ў ЖЫЦЦІ ХАЧУ ДАБІЦЦА ДЗЯКУЮЧЫ МУЗЫЦЫ»



**Якасная праца не застаецца незаўважанай. І поспех гурта BosaeSonca — таму пацвярджэнне. Летась ён запісаў два альбомы: рокавы «Залаты» і лірычна-акустычны «Адпусці», якія не абмінулі ўвагай як эксперты, так і прыхільнікі. Па версіі прэміі «Rock Profi» гурт прызнаны лепшым дэбютам года. У лютым дыск атрымаў узнагароду ад экспертаў партала Experty.by у намінацыі «Лепшы беларускамоўны альбом». Наша сустрэча з фронтменам гурта BosaeSonca Алесем Катом-Зайцавым адбылася напярэдадні сольнага канцэрта, і мы пагутарылі з ім пра музыку, свабоду і перспектывы.**

***— У адным інтэрв'ю вы дзяліліся, што ў свой час бацькі проста пераступілі цераз сябе і далі вам поўную свабоду дзеянняў. Як гэта на вас паўплывала?***

— Па-рознаму. У плане ўладкавання свайго жыцця я магу сказаць, што шчаслівы чалавек, бо займаюся любімай справай. Жыву ў радасці і не прачынаюся кожны дзень з думкай «вось зноў трэба прымусіць сябе ісці працаваць». І гэта якраз дзякуючы таму, што на мяне не ціснулі, не прымушалі нечым заняцца, а далі права выбару. У мяне з пэўнага ўзросту была прага да іншага жыцця, да свабоды, таму, напэўна, я знайшоў свой шлях.

***— Зазвычай музыканты — папулярныя ў школе людзі, якія маюць шмат сяброў. А вы неяк прызналіся, што ў школьныя гады іх у вас не было. А ў дзяўчат папулярнасцю карысталіся?***

— У нас была свая суполка, з парай прыяцеляў, з якімі я іграў у тагачасным гурце. Але збольшага гэта былі не музыканты, а мае сябры. Ці карыстаўся я папулярнасцю сярод дзяўчат? Цяпер ужо азіраючыся, я разумею, што была пэўная папулярнасць, аднак з-за сваёй нейкай сціпласці я ёй ніяк не карыстаўся. Я быў увесь у сабе, у сваёй творчасці. І трымаўся на дыстанцыі ад усіх.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

РазМЕРКАВАННЕ

# «НЕПАПУЛЯРНАЯ» ПРАФЕСІЯ?
## Для каго як...

**Пачуўшы слова «ляснічы», многія, напэўна, уяўляюць сабе пажылога мужчыну, абавязкова з барадой, які ледзь не ўсё сваё жыццё правёў у невялічкай хаце пасярод лесу. Памочніку ляснічага Дзмітрыю ДОЎНАРУ ўсяго 24, і барады ў яго няма. У Прыбярэзінскае лясніцтва Бабруйскага лясгаса ён трапіў па размеркаванні два гады таму. Тэрмін адпрацоўкі ўжо скончыўся, але сыходзіць з цяперашняга месца працы хлопец не збіраецца.**

...Невялікі двухпакаёвы будынак лясніцтва знаходзіцца за 10 хвілін язды ад Бабруйска. Раней ён належаў мясцоваму вайсковаму лясгасу. Цяпер жа ў ім «прапісаліся» два лясніцтвы — Бабруйскае і Прыбярэзінскае. Супрацоўнікі лясгаса хутка праявілі свае творчыя здольнасці, і цяпер тут мала што нагадвае пра колішніх гаспадароў. Калідоры ўпрыгожаны карцінамі і фотаздымкамі з выявамі беларускай прыроды. У холе — чучалы прадстаўнікоў мясцовай фауны: дзіка, воўка, цецерука і іншых.

— Любоў да лесу ў мяне, што называецца, у крыві, — распавядае Дзмітрый. — Я нарадзіўся на Старадарожчыне, у пасёлку Палажэвічы. Маці працавала медыкам, а тата быў леснікам. Так што я, лічыце, прадстаўнік дынастыі. Безумоўна, прафесія бацькі вельмі паўплывала на мой выбар. Цяпер яна не вельмі папулярная — у апошнія гады на маю спецыяльнасць недабор. Але перада мной пытання, куды ісці вучыцца, амаль што не паўставала.

Пасля заканчэння вясковай школы Дзмітрый па накіраванні ад Магілёўскага лесагаспадарчага аб'яднання паступіў у БДТУ на лесагаспадарчы факультэт. Пры паступленні здаваў тэсціраванне па хіміі, матэматыцы і мове. Цікавы факт: сярод яго аднакурснікаў было ажно 70 працэнтаў дзяўчат. Пасля атрымання дыплома аб'яднанне накіравала яго ў Бабруйск на адпрацоўку.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*



Па дыяметры ствала Дзмітрый можа вызначыць прыблізны ўзрост дрэва.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Тэхналогіі будучыні

# 3D-ДРУК: АД ФАНТАСТЫЧНЫХ ЗАДУМ — ДА РЭЧАІСНАСЦІ

**Цэнтр навуковай творчасці студэнцкай моладзі «ФабЛаб» адкрыўся на базе Фундаментальнай бібліятэкі БДУ.**

«ФабЛаб» абсталяваны прынтарам 3D GubeX Trio. Без гэтай ультрасучаснай прылады сёння не абыходзіцца ніводная галіна: з яе дапамогай рэалізоўваюцца самыя розныя творчыя праекты і выпрацоўваецца практычна ўсё задуманае. Ёсць думка, што 3D-друк — менавіта тая тэхналогія, якая дазволіць здзейсніць наступны прарыў і цалкам пераверне наша жыццё. Толькі ўявіце сабе, што вы зможаце «надрукаваць» на прынтары ўсё, што заўгодна — ад простых пластмасавых фігурак да інструментаў, адзення, веласіпеда, зброі і нават чалавечых органаў на аснове ствалавых клетак!..




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

***Ідэя трохмернага друку з'явілася ў таленавітага вынаходніка Чака Хала яшчэ ў пачатку 1980-х гадоў. Першы «апарат для вытворчасці трохмерных аб'ектаў па тэхналогіі стэрэаліташрафіі» быў выпушчаны ў 1986 годзе, а сам тэрмін «стэрэаліташрафія» з'явіўся на два гады раней і меў на ўвазе «спосаб вырабу цвёрдых аб'ектаў пры дапамозе паслядоўнага друку тонкіх слаёў матэрыялу адзін паверх другога». Большасць 3D-прынтараў выкарыстоўваюць для друку пластыкі, аднак ужо сёння існуюць мадэлі, здольныя працаваць і з некаторымі металамі — сталлю, серабром і золатам. Напрыклад, у Прынстанскім універсітэце здолелі «надрукаваць»... вуха, прычым не з пластыку, а з дапамогай біямасы з вялікай колькасцю ствалавых клетак, здольных трансфармавацца ў храстковыя тканкі. Гэта не паўнавартаснае вуха, а штосьці накшталт прылады для ўспрыняцця радыёхваляў. А ў Карнэльскім універсітэце распрацоўваюць методыку аднаўлення пашкоджаных міжпазванковых дыскаў з дапамогай біямасы з ствалавымі клеткамі. Дыскі друкуюцца на 3D-прынтары. Таксама даследчыкі з Карнэльскага ўніверсітэта змаглі надрукаваць на ўнікальных прынтары шакалад, пячэнне, яблык, сыр, зефір, хлеб і іншыя прадукты. Замест пластыку яны задзейнічалі гідрафільныя палімеры, якія актыўна выкарыстоўваюцца ў харчовай прамысловасці. Гэтую тэхналогію ўжо асвойвае НАСА, распрацоўваючы «меню» для працяглых касмічных вандровак.***

— Я бясконца ўражаны і ўсхваляваны тымі магчымасцямі, якія чакаюць нас у будучыні, — заявіў падчас адкрыцця ў БДУ цэнтра «ФабЛаб» **дырэктар навукова-тэхнічнай бібліятэкі імя Даламара Універсітэта штата Невада (ЗША) Патрык КОЎЛГАРАЎ.** — І я здымаю капялюш перад дырэктарам Фундаментальнай бібліятэкі і кіраўніцтвам БДУ, якія аднымі з першых у свеце пераасэнсавалі стаўленне да бібліятэк і іх уплыву на грамадства.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
15 05 2014 г.

# 3D-ДРУК...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У тых, хто ўпершыню бачыць 3D-прынтар, мозг літаральна «ўзрываецца» ад таго, на што здольная гэта тэхналогія. Так было і ў нашай бібліятэцы, калі мы ўстанавілі падобнае абсталяванне і студэнты пачалі рабіць свае 3D-мадэлі. З цягам часу яны пераўтвараюцца ў асобныя аб'екты і перарастаюць у сапраўдны бізнес. Я ўпэўнены, што тое ж самае чакае і беларускіх студэнтаў, якія скарыстаюцца гэтай тэхналогіяй.

У Цэнтры навуковай творчасці «ФабЛаб» маладым даследчыкам прадастаўлены бясплатны доступ да праграмнага забеспячэння спецыялізаванай тэхнікі, забяспечаць метадычнай літаратурай і акажуць ім прафесійную кансультацыю па засваенні сучаснага інструментарыя лічбавай вытворчасці.

— Прынтар 3D GubeX Trio валодае вялікай камерай для пабудовы аб'ектаў, якая дазваляе ствараць дэталі памерам з баскетбольны мяч. Прыстасаванне мае тры экструдары для друкавання адначасова трыма колерамі. Расходны матэрыял — пластык двух відаў: традыцыйны і экалагічны. Калі ў струменным прынтары ёсць галоўка, адкуль на паперу паступаюць чарніла, то ў 3D-прынтары замест фарбаў выкарыстоўваецца пластыкавы дрот, які плавіцца і слой за слоем стварае той ці іншы аб'ект у адпаведнасці з зададзенай праграмай, — тлумачыць тэхнічны бок справы **дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Пётр ЛАПО**. — Як расказалі нашы амерыканскія калегі, на стварэнне аднаго аб'екта ў іх ідзе ад 40 хвілін да 40 гадзін у залежнасці ад аб'ёму і складанасці распрацоўкі. Прынтар задзейнічаны ўсе 24 гадзіны ў суткі. І за 1,5 года яго эксплуатацыі на ім было створана ўжо 3 тысячы розных аб'ектаў. Шляхам 3D-мадэлявання можна праектаваць дэталі многіх тэхнічных прылад, рабіць візуалізацыю хімічных формул, крышталічных структур, ствараць аб'екты мастацтва і г.д.

Кошт прынтара складае 20 тысяч долараў ЗША. Белдзяржуніверсітэт атрымаў грант на яго набыццё ў многім дзякуючы Пасольству ЗША ў Рэспубліцы Беларусь. Так, супрацоўнікі інфармацыйнага цэнтра пасольства дапамаглі ўніверсітэту ў падрыхтоўцы заяўкі на грант і прадставілі ім інфармацыю аб выкарыстанні 3D-прынтараў у амерыканскіх бібліятэках.

**Аташэ па культуры Пасольства ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Робін САЛАМОН**, якая прысутнічала на адкрыцці «ФабЛаб», прызналася, што дагэтуль таксама ніколі не бачыла, як працуе 3D-прынтар, і ўпершыню змагла назіраць за гэтым працэсам менавіта ў БДУ.

— Стварэнне 3D-мадэляў — гэта інавацыя не толькі для беларускіх, але і для амерыканскіх студэнтаў, — канстатавала Робін Саламон. — Мяркую, што і ў ЗША, і ў Беларусі бібліятэкі з'яўляюцца найлепшым месцам для таго, каб людзі прыходзілі і знаёміліся тут з новымі тэхналогіямі. Бібліятэкі даюць магчымасць шырокаму колу людзей па-новаму паглядзець на нейкія рэчы і пачарпнуць новыя ідэі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Такой жа думкі прытрымліваецца і **першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

— У нас ёсць задума пабудаваць новы сучасны будынак для бібліятэкі будучыні. І адкрыццё на базе Фундаментальнай бібліятэкі Цэнтра навуковай творчасці студэнцкай моладзі «ФабЛаб» — гэта толькі адзін з этапаў развіцця Фундаментальнай бібліятэкі. Вельмі спадзяёмся, што з дапамогай новых тэхналогій студэнцкая моладзь зможа ўвасобіць у жыццё самыя вар'яцкія і фантастычныя свае задумы.

Трэба дадаць, што першая «ФабЛаб» была адкрыта ў 1998 годзе ў Масачусэцкім тэхналагічным інстытуце. Пазней, дзякуючы прынцыпам адкрытасці і даступнасці, «ФабЛаб» ператварылася ў глабальную сетку лабараторый, якія працуюць на падставе агульных прынцыпаў, выкарыстоўваюць падобнае абсталяванне і тэхналогіі і абменьваюцца ідэямі і рэсурсамі. Сёння ў свеце налічваецца ўжо больш як 270 такіх цэнтраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ЦІКАВА ВЕДАЦЬ:**

*Брытанская кампанія MakieLab выпусціла бясплатную мабільную прыладу, з дапамогай якой можна ствараць лялькі, прыдумаць ёй знешнасць і адзенне. Пасля гэтага застаецца заказаць цацку, якая будзе надрукавана на 3D-прынтары. Каштуе гэтае задавальненне 88 долараў. А кітайская архітэктурная кампанія Winsun заявіла аб стварэнні рабочага прататыпа 3D-прынтара, які ў якасці будаўнічага матэрыялу выкарыстоўвае будаўнічае сумесі. Пасля завяршэння тэсціравання прынтар зможа за суткі выпускаць па пяць жылых будынкаў. Акрамя хуткасці тэхналогіі, стваральнікам удалося дабіцца і неверагоднай яе таннасці. Цалкам узведзеная каробка дома будзе каштаваць не больш за 5 тысяч долараў. Адзіная праблема — гіганцкія памеры 3D-прынтара (150 метраў), а дакладней, праблемы з яго перамяшчэннем з адной будаўнічай пляцоўкі на іншую.*

*Прагрэс — вучэбнаму працэсу*

# ЛАБАРАТОРЫЯ «СОЧЫЦЬ» ЗА КОЖНЫМ СТУДЭНТАМ

**Інтэрнэт, да якога мы ўсе прызвычаіліся і магчымасцямі якога актыўна карыстаемся (напрыклад, вэб-сайтамі і інш.), прагрэсуе ва Усеабдымны інтэрнэт, да якога будуць падключаны ўсе машыны, тэхналогіі і працэсы. Калі сёння ў сеціўным трафіку дамінуюць камунікацыі «чалавек — чалавек», то ў бліжэйшай будучыні на першы план выйдзе трафік «чалавек — машына» або «чалавек — аб'ект», а потым — «машына — машына» або «аб'ект — аб'ект». Сёння ў свеце да інтэрнэту падключана толькі 0,5% фізічных аб'ектаў, а ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі падключаны будуць ужо ўсе аб'екты на планеце. Усё гэта дасць велізарны эканамічны эфект, які ацэньваецца прыблізна ў 19 трлн долараў ЗША ў глабальным вылічэнні. Такую карціну намаляваў прысутным на адкрыцці ў БДУІР вучэбнага цэнтра Акадэміі Cisco кіраўнік прадстаўніцтва кампаніі Cisco ў Беларусі і краінах СНД Павел БУРБА.**

— Эканамічны эфект будзе размеркаваны па ўсёй планеце. І для таго, каб беларуская доля эфекту не прайшла міма нас, наша задача паклапаціцца пра тое, каб кожны IT-спецыяліст, які выходзіць з беларускіх ВНУ, умеў і быў гатовы працаваць з глабальным інтэрнэтам, — дадаў Павел Бурба.

У 2012 годзе Cisco і БДУІР дамовіліся аб разгортванні ў БДУІР праграмы Сеткавай акадэміі Cisco. Кампанія ўжо дапамагла факультэту камп'ютарнага праектавання аснасціць дзве сучасныя лабараторыі. Трэцяя лабараторыя — вучэбны цэнтр «Дасканалыя сістэмы» — стала прадуктам супрацоўніцтва Cisco і кампаніі «Дасканалыя сістэмы» .

Цэнтр уяўляе сабой абсталяваны па апошнім слове тэхнікі клас, дзе студэнты будуць атрымліваць самыя сучасныя і запатрабаваныя веды. Кошт перададзенага кампаніяй «Дасканалыя сістэмы» абсталявання складае 250 мільёнаў рублёў, прычым яно будзе пастаянна абнаўляцца. Праз гэтую лабараторыю пройдуць студэнты спецыяльнасцяў «тэхнічнае забеспячэнне бяспекі» і «электронныя сістэмы бяспекі».

Высокі ўзровень падрыхтоўкі слухачоў будзе пацверджаны сертыфікатам міжнароднага ўзору, які прызнаецца наймальнікамі ва ўсім свеце. Між іншым, па звестках даследавання кампаніі Forester, кіраўнікі IT-сферы пры прагназаванні эфектыўнасці работы будучага супрацоўніка ставяць на першае месца якраз сертыфікацыю, а наяўнасць вышэйшай адукацыі — толькі на другое.

— Супрацоўніцтва з Cisco дазволіць нам падрыхтаваць выпускнікоў, якія пасля прыходу на працу змогуць адразу ж, без разгойдвання і перанавучання, уключыцца ў рабочы працэс. Спецыялісты з такой падрыхтоўкай проста нарасхват. Студэнты яшчэ вучацца, а заяўкі на іх размеркаванне ад патэнцыяльных працадаўцаў ужо ляжаць ва ўніверсітэце, — кажа **дэкан факультэта камп'ютарнага праектавання БДУІР Сяргей ДЗІК.**

Трэба дадаць, што і кіраўнік кампаніі «Дасканалыя сістэмы» Павел Рабаў, і Павел Бурба з'яўляюцца выпускнікамі БДУІР. Павел Рабаў скончыў універсітэт у 2002 годзе, а кіраўнік прадстаўніцтва Cisco Systems у Беларусі і краінах СНД — 20 гадоў таму. Абодва канстатуюць, што ўмовы навучання ва ўніверсітэце змяніліся кардынальна, быццам гэта дзве розныя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

— Мы цяпер збіраем дывідэнды з таго, што заклалі ў сваіх выпускнікоў, выхоўваючы іх патрыётамі сваёй ВНУ, — не без гонару канстатуе **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — У нас ужо створана ва ўніверсітэце 34 сумесныя навучальна-навукова-вытворчыя лабараторыі. Але расслабляцца ўсё роўна нельга. Мы павінны ствараць усе ўмовы для атрымання нашымі студэнтамі ведаў, якія будуць запатрабаваны ва ўмовах усё больш тэхналагічна залежнай эканомікі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**




**ЦІКАВА ВЕДАЦЬ:**

*На думку футуролагаў Cisco, мы ўступаем у эпоху, калі інтэрнэт можа радыкальна палепшыць і падоўжыць жыццё кожнага жыхара нашай планеты, вылечыць цяжкія захворванні, дапамагчы вырашэнню кліматычных праблем і зрабіць кожны дзень нашага жыцця больш шчаслівым. Усеабдымны інтэрнэт спалучыць магчымасці інтэрнэту з рэальным жыццём і зробіць усе прадметы, што нас акружаюць, інтэлектуальнымі. Падключаныя аб'екты змогуць самастойна збіраць, аналізаваць патрэбную інфармацыю і дапамагаць людзям. Напрыклад, банкаматы, абсталяваныя камерамі з функцыяй распазнавання твараў і аналітычнымі праграмамі, падключанымі да базы звестак праваахоўных органаў, змогуць аказваць рэальную падтрымку ў затрыманні злачынцаў. Медыцынскае абслугоўванне ператворыцца ў непарыўны працэс, які штодня суправаджае кожнага чалавека. Патэнцыяльная выгада ад падключанай сістэмы аховы здароўя і маніторынгу пацыентаў ацэньваецца ў 106 млрд долараў.*

*Слова маладых*

# РАСКАЖЫ ПРА СВАЮ «БЕЛУЮ РУСЬ»

**Рэспубліканскі конкурс для маладых журналістаў «Залатое пяро Белай Русі» праводзіцца ўжо другі раз. Летась перад журы стаяла цяжкая задача — выбраць самых лепшых і крэатыўных з 350 адабраных работ. Чаго чакаюць арганізатары сёлета, распавёў прэс-сакратар РГА «Белая Русь» Яўген БЕЛАВУСАЎ.**

***— Адчуваецца, што конкурс займеў папулярнасць — на яго было даслана каля 700 работ, палова з якіх прайшла адбор. Вашы ўражанні?***

— Конкурс стане традыцыйным. Летась ён выклікаў шырокі рэзананс: па многіх работах былі спрэчкі. Наведвальнікі сайта актыўна каментавалі заяўленыя публікацыі: адны шукалі заганы і нават выяўлялі плагіят, а іншыя хвалілі і рэкамендавалі пададзеныя работы. Пераможцы прайшлі праз дастаткова строгі адбор афіцыйнага і «неафіцыйнага» журы. Бацькі, самі ўдзельнікі, выкладчыкі, прадстаўнікі «пярвічак» — усе сачылі за конкурсам, наведвальнасць сайта вырасла ў два разы, бясконца сыпаліся званкі, звароты. Летась мы былі завалены школьнымі сачыненнямі аб прыгажосці Беларусі. Цяпер вырашылі засяродзіцца на намінацыях, прысвечаных дзейнасці і прасоўванню «Белай Русі».

***— Што датычыцца сачыненняў пра прыгажосць Беларусі... Якой наша краіна паўстала ў публікацыях?***

— Усе ганарацца, што жывуць тут, адчуваецца патрыятызм — тое, што не вельмі ўласціва моладзі пасля 20 гадоў. А дзеці выказваюць шчыра і, напэўна, не без уплыву бацькоў, якія таксама захоўваюць любоў да радзімы.

***— Мяркуючы па работах, многія ўдзельнікі конкурсу натхнёна распавядалі пра сваю малую радзіму — вёску, гарадскі пасёлак... Але ці акрэсліці яны праблемы сацыяльнага альбо эканамічнага кшталту?***

— Ведаеце, сёння журналістыка часам вельмі павярхоўная. Распавядаючы пра родныя мясціны, маладыя аўтары часцей за ўсё закранаюць гісторыю і славутасці. Яны не імкнуцца прааналізаваць, адшукаць праблему і тым больш прапанаваць яе вырашэнне, хаця праблем даволі многа. Не хапае інфарматыўнасці, з-за гэтага матэрыялы губляюць сваю каштоўнасць. Мы ўлічылі гэтую акалічнасць і чакаем работы, якія можна было б выкарыстаць у іншых праектах, напрыклад, краязнаўчых.

***— Ці плануеце праводзіць майстар-класы для маладых аўтараў?***

— Для адукацыйных праектаў дастаткова журналісцкіх гурткоў, якія ёсць амаль у кожным цэнтры дзіцячай творчасці. Мы, у сваю чаргу, ствараем пляцоўку для самавыяўлення маладых журналістаў. Працы нашых пераможцаў залічваюцца як творчыя публікацыі пры паступленні на журфак.

***— Пераможцы мінулага года, юныя карэспандэнты гуртка «Маладзік» з Маладзечна, адразу пасля вашага конкурсу прадставілі перадачу для тэлеканала СТБ. Ці адсочваеце далейшы лёс сваіх аўтараў?***

— Так, у канцы сакавіка падведзены вынікі мінскага гарадскога конкурсу юнацкіх СМІ, на якім маладзечанцы занялі першае месца ў намінацыі «лепшая газета». А ўвогуле, маладзечанская «пярвічка» «Белай Русі» актыўна супрацоўнічае з маладымі карэспандэнтамі «Маладзіка». Узаемадзеянне ёсць.

***— А якой паўстае «Белая Русь» у публікацыях юных аўтараў?***

— Усе зразумелі: «Белая Русь» створана для таго, каб рабіць нейкія канкрэтныя справы, дапамагаць людзям. Дзеці пачалі наведваць нашы мерапрыемствы і прымаць у іх удзел. Навагоднія акцыі, суботнікі, віншаванні народжаных у Дзень Незалежнасці — усе гэтыя падзеі знайшлі адлюстраванне ў работах конкурсантаў. Напрыклад, пераможца паднамінацыі "Я пішу пра Белую Русь" Юлія Шульгоўская з Магілёва даўно цікавілася дзейнасцю арганізацыі, бо тут працуе яе бабуля. Напэўна, ёй было лягчэй, бо яна «варылася» ў гэтым.

***— Чаго чакаеце ад конкурсу сёлета?***

— Хочацца ўбачыць больш работ па дзейнасці «Белай Русі». Нам патрэбныя свежыя ідэі для развіцця. Спадзяюся, юныя аўтары падключацца і прапануюць цікавыя праекты. Таксама сумесна з газетай «Звязда» будзем праводзіць маштабны краязнаўчы праект, прысвечаны мясцінам Беларусі. Кожны чалавек можа расказаць пра сваю родную вёску, гарадскі пасёлак, горад тое, што не ўсе ведаюць. У «Вікіпедыі» некаторых мясцін няма — як быццам і не было ніколі. Па крупельцы будзем збіраць інфармацыю, каб ствараць інтэрнэт-праект, таму чакаем матэрыялы па краязнаўчай тэматыцы.

***— Што б вы пажадалі аўтарам-пачаткоўцам?***

— Не трэба здавацца пры першай няўдачы. Прабівайце сабе дарогу, вучыцеся на сваіх памылках і ідзіце з новымі сіламі ў новы бой.

**Кацярына РАДЗЮК.**

**P.S.** *Пра папярэднія вынікі творчага конкурсу «Чырвонкі» «Мы — такія!...», які праводзіцца пры інфармацыйнай падтрымцы Міністэрства адукацыі, чытайце на старонках 4-5.*

*Удалечыні ад дома*

# ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ НЕ ПРАЗ ШКЛО

## ...і зразумець, што для цябе галоўнае



**Ад Полацка да пасёлка Баравуха каля дваццаці хвілін язды на дызелі. Дадаць сюды яшчэ пятнаццаць хвілін хады — і атрымаецца шлях, які двойчы на дзень здзяйсняе Алёна Канюшэўская, едучы на працу і вяртаючыся з яе. Дзяўчына летась скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «Музеязнаўства» і працуе па размеркаванні ў аддзеле фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.**

### «ПРА ВЫБАР НЕ ШКАДУЮ...»

Алёна — танклявая дзяўчына са светлымі вачыма, жыццярадаснай усмешкай і задорна ўзнятым уверху носам — жыве ў пасёлку пад Полацкам, дзе раней была воінская часць. Папрацаваўшы менш за год, малады спецыяліст ужо займае пасаду старшага навуковага супрацоўніка. Нягледзячы на невялікі для гэтага звання вопыт, са сваімі абавязкамі Алёна спраўляецца.

— У дзяцінстве марыла стаць настаўніцай, потым урачом, юрыстам. Але жыццё распарадзілася інакш. У час паступлення паспрабавала зрабіць стаўку на тыя веды, у якіх была ўпэўнена, а менавіта на гісторыю. У Мінску ў мяне працаваў брат, таму адразу вырашыла паступаць у сталіцы. Але настаўнікам гісторыі быць не вельмі хацелася. Даведалася пра існаванне спецыялізацыі «Музейная справа і ахова гісторыка-культурных каштоўнасцяў» ва Універсітэце культуры, паспрабавала паступіць туды — і ў мяне атрымалася, — усміхаецца мая суразмоўца і дадае, што ўсё ж марыць набыць яшчэ і юрыдычную адукацыю.

На працу ў Полацк дзяўчына ішла мэтанакіравана: праходзіла тут практыку, пісала дыплом і ўзяла запыт на размеркаванне.

— Выбрала гэты горад таму, што ён невялікі і адначасова велічны — калыска нашай гісторыі і культуры. Тут шмат помнікаў архітэктуры, археалогіі, да якіх хочацца дакрануцца, адчуць тую эпоху, у якой яны існавалі ці былі створаны. Хочацца дапамагчы зберагчы іх для нашчадкаў. Адыграла сваю ролю і тое, што з Полацка вельмі зручна дабірацца да роднага дома, а таксама тое, што тут мой заробак больш-менш суразмерны выдаткам.

Па словах Алёны, пра свой выбар яна не шкадуе, ды і асаблівых нечаканасцяў праца па размеркаванні не прынесла.

— Універсітэт дае тэарэтычныя веды, пры выкарыстанні якіх на практыцы ёсць пэўныя цяжкасці. Вельмі карыснымі сталіся спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны. А вось «музейная» адукацыя дапамагае зразумець, пра што кажуць разумныя людзі, — смяецца дзяўчына. — Што непасрэдна да маёй працы, то я вяду картатэку, займаюся апрацоўкай старых паступленняў (маркірую іх, фатаграфую, апрацоўваю здымкі ў графічных рэдактарах) і кансультую музейных работнікаў на некаторых пытаннях.

### У САМЫМ «СЭРЦЫ» ГІСТОРЫ

У Полацкі музей-запаведнік уваходзіць адзінаццаць музеяў, у якіх агульныя фонды. Алёна прыйшла працаваць у самае «сэрца» полацкай гісторыі таксама мэтанакіравана: хацела зразумець «музейную кухню». Па яе словах, менавіта ў фондах адбываецца ўсё самае цікавае.

**Увогуле, захавальнікі — людзі апантаныя. Яны настолькі дасканала ведаюць свае калекцыі, што сярод ночы могуць сказаць, дзе што ляжыць. Мне вельмі пашанцавала з калектывам.**

— Некаторыя думаюць, што тут няма чаго рабіць. Але гэта не так — прынамсі, у нас. Акрамя непасрэдна фондаўскіх спраў, нашы супрацоўнікі рыхтуюць выставы — як з нашых калекцый, так і з прывазных. Увогуле, захавальнікі — людзі апантаныя. Яны настолькі дасканала ведаюць свае калекцыі, што сярод ночы могуць сказаць, дзе што ляжыць. Мне вельмі пашанцавала з калектывам, а таксама пашчасціла дакрануцца да таго, на што іншыя глядзяць толькі праз шкло.

Але спецыфіка работы ў фондах (у прыватнасці, праца з камп'ютарам) мае і адмоўныя бакі: за час працы ў Алёны крыху сапсаваўся зрок.

— Усе нашы супрацоўнікі носяць акуляры. Хутка і я буду. Мы ж такія: пакуль справу не скончыш — ад камп'ютара не адыдзеш,— усміхаецца яна.

«Сюрпрызам» для дзяўчыны не стаў і яе заробак. І ўсё ж Алёна прызнаецца, што калі ўбачыла першую зарплату ў 1,7 мільёна рублёў, засмуцілася, бо не ведала, як жыць на гэтыя грошы. Цяпер заробак дзяўчыны ў статусе старшага навуковага супрацоўніка складае каля 2,5 мільёна.

— У бюджэтных арганізацыях заробкі невялікія, — канстатуе яна. Таму даводзіцца ў нечым сабе адмаўляць. Перад тым, як патраціць грошы, думаеш, ці трэба гэта рабіць на самой справе. Заробак разыходзіцца хутка — з улікам ежы, аплаты камунальных паслуг і выдаткаў на праезд.

Алёна яшчэ не ведае, ці застанецца працаваць пасля заканчэння кантракта. Працаваць у фондах ёй падабаецца, хоць ёсць тут і свае праблемы. Але прысутнічаюць і станоўчыя моманты: арганізоўваюцца экскурсіі для супрацоўнікаў па Беларусі і замежжы — для пераймання вопыту.

### СУМАВАЦЬ НЕ ДАВОДЗІЦЦА

Месцаў, дзе можна бавіць вольны час, у Полацку і суседнім Наваполацку хапае. Але, вядома, з «музейным» заробкам наведваць іх можна нячаста. Таму выхадныя Алёна праводзіць за чытаннем, запрашае да сябе пагасціць пляменнікаў, а яшчэ навучылася вязаць. Дзяўчына кажа, што ёй пашчасціла сустрэць шмат сапраўдных сяброў, якія, як і шматлікія сваякі, жывуць у розных гарадах краіны. Таму часта выхадныя праходзяць у падарожжах: Мінск, Віцебск, Магілёў, Гомель... Прыязджаюць сябры і да Алёны, і яна, добра арыентуючыся ў горадзе, паказвае ім яго, але ж прафесійна праводзіць экскурсіі пакуль не можа.

Не даюць сумаваць маладому спецыялісту не толькі даўнія сябры, але і калегі. У калектыве ёсць традыцыя: маладыя супрацоўнікі раз у некалькі месяцаў ходзяць разам у кавярню ці боўлінг. Гэта дае магчымасць лепш пазнаёміцца, абмеркаваць нешта, бо падчас працы людзі «раскіданы» па розных будынках.

— Я не адчуваю сябе самотнай, калі жыву адна, — падсумоўвае дзяўчына. — Увогуле чалавеку перыядычна трэба заставацца аднаму, бо часта, выходзячы на вуліцу, ты забываеш, што для цябе галоўнае. Калі ты пастаянна ў акружэнні людзей, то слухаеш думкі іншых і перастаеш чуць сябе. Пасля таго, як пакінула дом, я вельмі змянілася. На мяне, безумоўна, паўплываў шумны горад, пераезд у студэнцкі інтэрнат. Цяпер, калі нават першакласнікі выбіраюць сяброў у залежнасці ад «круцізны» смартфона, вельмі складана вызначыць сапраўдныя жыццёвыя прыярытэты. Але, напэўна, маё выхаванне і вера ў людзей дапамагаюць мне ў гэтым.

Цяпер у мяне спакойная размераная работа, якая мне вельмі падабаецца. Я ні ад каго не залежу, працую ў добрым калектыве. Вядома, часам хочацца нейкіх яркіх эмоцый, але пакуль я ўсё спісваю на тое, што ў мяне было бурнае студэнцтва. Ды й нельга, каб жыццё пастаянна кіпела. Для таго, каб цаніць некаторыя моманты, трэба, каб яны здараліся рэдка...

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*Мінск — Баравуха — Мінск.*

# «НЕПАПУЛЯРНАЯ» ПРАФЕСІЯ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У горад над Бярэзінай Дзмітрый прыехаў з сябрам-аднакурснікам. Лясгас адразу дапамог маладому спецыялісту наладзіць быт: аднапакаёвую кватэру для яго здымае сам працадаўца (маладым спецыялістам аказваецца матэрыяльная дапамога). На працу Дзмітрый ездзіць або на сваім аўтамабілі, або на грамадскім транспарце. Свой заробак у 5,5 мільёна рублёў ён лічыць «прыстойным».

Лесаводаў тут паважаюць — непасрэдны начальнік Дзмітрыя, ляснічы Юрый АКУЛІЧ, летась быў названы «Чалавекам года» ў Бабруйскім раёне. Што і казаць, калі нават на гербе Бабруйска змешчаны мачты: у мясцовых лясах расце сасна, з якой выраблялі гэтыя карабельныя дэталі. Дрэваапрацоўка і, адпаведна, лесаводства заўжды былі важнейшым складнікам мясцовай эканомікі.

**Ёсць пэўныя нарматывы па доглядзе лесу, але я сам магу выбіраць метады апрацоўкі розных участкаў і розных дрэў, а потым назіраць за вынікам: дзе атрымалася лепш, а дзе горш. Таму ў маёй рабоце ёсць і вялікі працэнт творчасці.**

— Мая галоўная задача ў лясніцтве — весці дакументацыю па ўліку ляснога фонду і мерапрыемствах, што праводзіліся ў лесе: дагляданых высечках, пасадках дрэў. Але нельга сказаць, што праца — выключна папяровая, бо ў любым з такіх мерапрыемстваў я прымаю непасрэдны ўдзел. Зрэшты, і для таго, каб запоўніць паперы, трэба таксама выехаць у лес, таму я там бываю практычна кожны дзень. Насамрэч, я пасрэднік паміж ляснічым і людзьмі, што працуюць менавіта ў лесе, — леснікамі. Адказваю за ўсё лясніцтва, а гэта больш як 13 тысяч гектараў тэрыторыі. Праца цяжкая, але назваць яе аднастайнай і нецікавай нельга. Напрыклад, ёсць пэўныя нарматывы па доглядзе лесу, але я сам



Прыбор візір і карта — рэквізіт для работы на свежым паветры.

магу выбіраць метады апрацоўкі розных участкаў і розных дрэў, а потым назіраць за вынікам: дзе атрымалася лепш, а дзе горш. Таму ў маёй рабоце ёсць і вялікі працэнт творчасці.

Якасць мясцовага лесу Дзмітрый ацэньвае вельмі высока. Сярод парод дрэў тут пераважаюць сосны. Працягласць жыцця такога дрэва складае прыкладна 300 гадоў, а таму лесаводы ў асноўным працуюць са спадчынай сваіх папярэднікаў. Дзмітрый кажа, што нават у самыя складаныя ў эканамічным плане часы (пасля атрымання Беларуссю незалежнасці) мясцовыя работнікі здолелі захаваць лес у належным стане.

А галоўнай праблемай у сваёй працы Дзмітрый называе стаўленне людзей да лесу. Ён лічыць адсутнасць павагі да прыроды вялікім недахопам у выхаванні:

— На жаль, людзі часта разглядаюць лес толькі як месца для разавага адпачынку. А таму дазваляюць сабе пакінуць смецце, не прыбрацца пасля гулянкі. А гэта наносіць дрэвам такую шкоду, якую цяжка нават уявіць. Не кажучы ўжо пра выпадкі, калі пакінутае ў лесе шкло спрацоўвае як лупа і ўтварае пажары. Шмат смецця таксама на могілках. Бывае, што ў такіх месцах банальна няма урнаў, але ў людзей заўжды ёсць магчымасць забраць смецце з сабой.

Самавольныя мерапрыемствы накшталт збору бярозавага соку, таксама наносяць дрэвам шкоду. Кожнаму збіральніку Дзмітрый рэкамендуе спачатку звярнуцца па дапамогу да спецыялістаў мясцовай ляснай гаспадаркі. Яны пакажуць дрэвы, прызначаныя для яго збору, а таксама патлумачаць, як зрабіць працэс бясшкодным для іх. Нават такія, здавалася б, бяскрыўдныя рэчы, як нарыхтоўка венікаў для лазні, трэба рабіць з розумам — ні ў якім разе не абломваючы верхавіны маладых дрэўцаў.

З праблемай лясных пажараў лясніцтва змагаецца даволі паспяхова — за апошнія гады іх колькасць значна паменшылася. Спрыяюць гэтаму і новыя тэхналогіі: цяпер за станам лесу назіраюць размешчаныя на вышках вэб-камеры.

— Чым асаблівае маё лясніцтва? — усміхаецца Дзмітрый. — Яно сапраўды вельмі прыгожае, прымыкае да Бярэзіны ў месцы, якое бабруйчане завуць Белым Берагам. Рака там паварочваецца на 180 градусаў, утвараючы паўвостраў. Адпачываць туды прыязджаюць сем'ямі. Галоўнае — умець бачыць гэтую прыгажосць.

Працоўны дзень памочніка ляснічага — з васьмі гадзін раніцы да шасці вечара. Але праца сама дыктуе ўмовы: калі-нікалі даводзіцца заставацца дапазна. Дзмітрый кажа, што часу на адпачынак у яго хапае. Сябе ён лічыць аматарам актыўнага баўлення часу. Для сваіх супрацоўнікаў Бабруйскі лясгас арандуе футбольную пляцоўку. Дзмітрый — яе заўсёднік. Дарэчы, на раённых спаборніцтвах зборная лясной гаспадаркі заняла 4-е месца. А яшчэ Дзмітрый — актыўны футбольны балельшчык: у Мінск ён ездзіў на еўракубкавыя матчы БАТЭ. Па тэлебачанні назірае за англійскай прэм'ер-лігай, «хварэе» за лонданскі «Арсенал». Акрамя гэтага, Дзмітрый наведвае басейн, гуляе ў валейбол. Адпачынак «для душы» — кінатэатр «Таварыш», які нядаўна рэканструявалі.

— Для мяне лес — гэта нешта большае, чым проста дрэвы і кустарнікі, — кажа Дзмітрый. — Нават калі прыгадаць гісторыю, ва ўсе часы ён абараняў нашу краіну ад ворагаў. І цяпер ён нас корміць — у прамым і пераносным сэнсе. Я сапраўды люблю лес, а таму люблю і сваю працу.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
**Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.**
*Мінск — Бабруйскі раён — Мінск.*



Любоў да лесу дапамагла Дзмітрыю ДОЎНАРУ выбраць будучую прафесію.

# ЖЫВЁМ І ПАМЯТАЕМ...

**УВАГА, АЎТАРЫ!**

*Прыём творчых работ на конкурс маладых і юных няштатных аўтараў «Мы — такія!..», які праводзіўся «Чырвонкай. Чырвонай зменай» пры інфармацыйнай падтрымцы Міністэрства адукацыі, скончаны. Увогуле на яго паступіла больш за 200 «проб пяра», прычым больш за палову — у апошнія дні перад вызначанай датай. На жаль, павінны канстатаваць, вялікая колькасць работ не адпавядае аб'яўленым умовам конкурсу («работу над памылкамі» праглядзём пасля). Разам з тым, нам прыемна адзначыць, што сярод дасланых заявак сустракаецца нямала цікавых, па-журналісцкі напісаных матэрыялаў. Праўда, і ў большасці такіх выпадкаў не хапае або звестак пра самога аўтара, або яго пашпартных даных, або хатняга адраса. Высвятленне гэтых нюансаў патрабуе часу. Таму, з улікам вышэйвыкладзенага, вынікі творчага конкурсу «Мы — такія!..» будуць падведзены ў канцы чэрвеня. Тады ж будуць аб'яўлены і імёны пераможцаў.*

**Вось ужо 70 гадоў аддзяляюць нас ад дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Выраслі новыя пакаленні, але і праз дзесяцігоддзі тэма вайны актуальнасць не страціла. Напэўна, цяпер не было б ні мяне, ні маіх бацькоў, ні маіх бабуль, каб не той шчаслівы выпадак, які адбыўся ў далёкім 1943 годзе.**

Мае бацькі родам з вёскі Грабаў Жыткавіцкага раёна. Там жывуць і абедзве мае бабулі. А мы жывём за чатыры кіламетры ад іх, у вёсцы Мілевічы. Трагічны лёс Хатыні і дзясяткаў іншых вёсак падзяліла і яна. Вёску Грабаў гэтая трагедыя мінула.

Побач з маёй бабуляй жыве Марыя Кірылаўна Міхнавец. Увесну 1943 года ёй было крыху больш за пяць гадоў. Але нягледзячы на такі малы ўзрост, яна і цяпер добра памятае тое, што адбылося тады.

Марыя Кірылаўна распавядае...

— У маёй маці Харыты нас было двое: я і малодшая сястра Валянціна. Бацькі нашага ўжо не было: загінуў у першыя месяцы вайны.

У той далёкі сакавік з боку вёскі Морач ішоў на Грабаў атрад добраахвотных памагатых нямецкай арміі. Камандзірам гэтага атрада быў Радыёнаў. Па нацыянальнасці — паляк, але вельмі добра размаўляў па-руску. Услед за атрадам ішлі салдаты нямецкай арміі. На той час яны ўжо спалілі жыхароў усіх суседніх вёсак. Прыход немцаў у вёску суправаджаўся стрэламі, крыкамі... Усе ўсведамлялі, што і іх чакае такіх ж лёс...

Бабуля, маці Харыты, баялася за жыццё дачкі і ўнучак, таму хацела адправіць нас да сваёй маці, якая жыла каля самага лесу, спадзеючыся на тое, што, калі пачнецца аблава, нам удасца схавацца ў лесе. Не паспелі! Трэба ж здарыцца такому, што вышэйшыя нямецкія чыны, у тым ліку і Радыёнаў, спыніліся на ноч менавіта ў нашай хаце. Усю ноч салдаты балявалі: пілі і гулялі. Радыёнаву спадабалася мая маці. Вельмі добра запомнілася, як ён прыстаўляў пісталет да яе галавы, пагражаючы расправіцца з яе дзецьмі — з намі. Сілай ён прымусіў маці Харыту бавіць з ім час...

Раніцай таго страшнага дня, калі жыхароў вёскі загналі ў будынак школы, Радыёнаў папрасіў Харыту прыгатаваць сняданак для яго і яго паплечнікаў і абавязкова знайсці самагонку. На што Харыта жорстка і катэгарычна заявіла: «Нічога я не буду рабіць. Маю маці разам з усімі збіраешся спаліць? А можа, і мяне туды разам з дзецьмі?». Яна горка заплакала.

Радыёнаў моўчкі выйшаў і без слоў пашыбаваў да будынка школы. Тут ужо адбывалася нешта неверагоднае: гвалт, крыкі, жах, праклёны... Дзверы зачыніліся. Ён падышоў да нямецкіх афіцэраў, перагаварыў з імі і... адчыніў дзверы! Што тут было: людзі падалі да яго ног, цалавалі боты, абдымалі. Усе разумелі, што сваім выратаваннем яны абавязаны Харыце.

Лёс вызваленых людзей склаўся па-рознаму. Адны ратаваліся ўцёкамі, хаваючыся ў лесе, іншых адправілі ў Германію.

Харыту разам з дачушкамі Радыёнаў забраў з сабой. У Старобіне нямецкія салдаты адабралі ў Харыты дзяцей. Яна была ў роспачы. Радыёнаў тут ёй нічым не мог дапамагчы. Цудам маці ўдалося ўцячы і знайсці сваіх дзяцей. Пешшу, лесам, пужаючыся кожнага гуку, яна вярнулася ў Грабаў. Хутка зразумела: цяжарная... Нарадзіўся хлопчык. Мы радаваліся свайму брацiку і аберагалі яго ад усяляких хвароб. Але пасля вайны лютаваў тыф. Чатыры гадзікі было нашаму брацiку, калі ён памёр.

Усё жыццё з павагай ставіліся аднавяскоўцы да Харыты, расказваючы дзецям шчымлівую гісторыю свайго ўратавання. Харыта сама выгадавала дзвюх дачок, дачакалася ўнукаў і праўнукаў.

Мяне глыбока кранула гісторыя, расказаная Марыяй Кірылаўнай. Бо тады, у будынку той школы, ва ўзросце чатырох месяцаў разам са сваёй маці была і мая бабуля, Вера Аляксандраўна Міхнавец...

**Яніна МІХНАВЕЦ,**
**вучаніца 11 класа**
**Мілевіцкага дзіцячага**
**сада—сярэдняй школы**
**Жыткавіцкага раёна.**

**ПРА АЎТАРА**

***— Пра сябе скажу проста — люблю жыццё! Люблю сваіх бацькоў, сяброў, школу. Больш за ўсё мяне прыцягваюць маленькія дзеці, іх непасрэднасць і шчырасць. Таму мару свой далейшы лёс звязаць менавіта з імі. Вучыцца буду абавязкова ў Мінску, — распавяла 17-гадовая аўтарка.***

***Сваё жаданне Яніна падмацоўвае добрай вучобай і пазакласнай дзейнасцю. Дзяўчына ўдзельнічае ў даследчых, навуковых канферэнцыях па літаратуры. Дарэчы, гэта яе любімы прадмет. Уменне прыгожа гаварыць зрабіла Яніну нязменнай вядучай мерапрыемстваў не толькі ў школе, але і па-за ёй. У вольны час аўтарка наведвае спартыўныя секцыі, вакальны гурток і гурток «Юны журналіст». Яшчэ яна захапляецца вязаннем.***

# ЧАЛАВЕК З СЭРЦАМ ДАНКА

**Упершыню трапіўшы ў аграгарадок Мацюшы, я была прыемна ўражана яго прыгажосцю: роўныя, шырокія вуліцы, добраўпарадкаваныя двары, прыгожыя дамы. Ёсць Дом культуры, бібліятэка, кантора, фельчарска-акушэрскі пункт. Але асаблівы гонар вёскі — прыгожы двухпавярховы будынак школы і дзіцячы садок. Я правучылася ў школе паўтара года і, прызнаюся, не задумвалася, чыёй гаспадарлівай рукой усё гэта створана, пакуль не адбылася ўрачыстая лінейка, прысвечаная светлай памяці Давіда Іванавіча Кахадзэ, былога кіраўніка калгаса «Зара» (цяпер ААТ «Мацюшы-Агра»).**



Можна прачытаць дзясяткі кніг, вершаў на патрыятычную тэматыку, — але ж зусім не факт, што ты станеш патрыётам. А пасля наведвання гэтага мерапрыемства ў мяне і маіх аднакласнікаў абудзілася пачуццё гонару за тое, што ў нашай вёсцы жыў такі таленавіты кіраўнік, чалавек, які шчыра любіў Беларусь і з вялікай пашанай ставіўся да зямлі і людзей, якімі кіраваў. У той дзень мы з аднакласнікамі бурна абмяркоўвалі пачутае і ўбачанае. Пасля гэтага мне вельмі захацелася даведацца больш пра Давіда Іванавіча — чалавека незвычайнага, апантанага любімай справай, чалавека-патрыёта з сэрцам Данка.

Нарадзіўся Давід Іванавіч Кахадзэ ў 1938 годзе ў Грузіі. З ранняга дзяцінства быў прывучаны да працы. Бацькі прывівалі Давіду, яго дзвюм сёстрам, Тамары і Жэні, а таксама брату Анастасу любоў да зямлі і да родных мясцін, вучылі ва ўсім бачыць прыгожае. З дзяцінства Давід любіў сады — садзіў дрэвы, вінаграднікі. Бацька Давіда — Вано Кахадзэ — лічыў, што чэрствы чалавек жыве ў тым доме, вакол якога няма ні дрэўца. Ён кіраваў калгасам, вучыў сваіх дзяцей цаніць працу іншых людзей і паважаць іх. У час Вялікай Айчыннай вайны Вано Кахадзэ загінуў пад Сталінградам.

Пасля школы Давід Іванавіч паступіў у сельскагаспадарчы тэхнікум, бо не ўяўляў сваё жыццё без працы на зямлі. Затым была служба ў Савецкай Арміі. Адзін год працаваў на радзіме ў тэхнікуме. Але любоў да зямлі і пастаяннае імкненне да пазнання новага прывялі маладога, прыгожага, мэтанакіраванага грузіна на беларускую зямлю. Ён стаў студэнтам Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

Менавіта тут ён сустрэў сваё сапраўднае, адзінае на ўсё жыццё, каханне. Беларуская дзяўчына Людміла забрала яго сэрца ў палон. У 1968 годзе нарадзілася дачка Ірына. Давід Іванавіч вырашыў звязаць свой лёс з беларускай зямлёй, хоць ніколі не забываў пра родную Грузію і сваіх родных, якія там засталіся.

У 1970 годзе Давід Іванавіч стаў старшынёй калгаса «Зара». Вяскоўцам не вельмі верылася, што ён надоўга затрымаецца ў іх. Калгас быў слабы, а работы — непачаты край. Амаль усё трэба было пачынаць з нуля. Але Давід Іванавіч працы і адказнасці за яе не баяўся. Калі малады кіраўнік браўся за справу, то абавязкова даводзіў яе да канца, калі штосьці абяцаў — то абавязкова выконваў. Аднавяскоўцы не маглі не ўбачыць шчырага клопату кіраўніка калгаса аб іх і іх сем'ях. Давіду Іванавічу паверылі, і ўсе разам узяліся паднімаць на ногі заняпалую гаспадарку.

Пачалі з будаўніцтва вытворчых памяшканняў. Потым будавалі дамы, фермы. Давід Іванавіч быў упэўнены, што на тэрыторыі калгаса павінна быць свая школа, і абавязкова вялікая, прыгожая і ўтульная. Ён верыў, што гаспадарка стане моцнай, прыедуць маладыя спецыялісты — а для іх сем'яў патрэбна жыллё і школа. Кожная пабудова каштавала вялікіх намаганняў кіраўніка, але ён верыў, што робіць добрую справу. Так з'явіліся крама, сельскі Дом культуры...

Жыццё ў вёсцы Мацюшы не толькі наладзілася, але і стала цікавым, насычаным. Людзі паважалі старшыню, ішлі да яго і ў горы, і ў радасці. І кожнага ён выслухоўваў, даваў параду, дапамагаў, калі гэта было ў яго сілах. Умеў цвёрда і рашуча сказаць «не», калі гэта супярэчыла яго перакананням. Трэба сказаць, што і дысцыпліна ў калгаснікаў была жалезная не таму, што баяліся кіраўніка, а таму, што сорамна было страціць давер такога чалавека.

Разглядваю фотаздымак Давіда Іванавіча і прыгадваю словы аднавяскоўцаў: «Ён быў просты і даступны, вышэй за ўсё цаніў чалавечае жыццё, для яго не было дробязяў, ён імкнуўся зрабіць жыццё вяскоўцаў блізкім па камфортнасці да гарадскога ўзроўню». Давід Іванавіч ніколі і нікому не дазваляў крытыкаваць сваіх падначаленых і заўсёды раённаму кіраўніцтву казаў: «Мае спецыялісты — добрыя, я нікому іх у крыўду не дам, я — кіраўнік, мяне і крытыкуйце!»

Як садоўнік з любоўю і клопатам садзіць свой сад, так і Давід Іванавіч стварыў свой калгас. Яго любілі, паважалі, гатовы былі выканаць любое яго даручэнне. Пацілі любоўю за клопат і неабыякавасць.

Цяжка сказаць, якую з дзвюх сваіх радзім Давід Кахадзэ любіў больш. Грузію, дзе нарадзіўся, дзе пакінуў родных, дзе засталіся сады і вінаграднікі, што пасадзіў, або Беларусь, дзе пражыў большую частку свайго жыцця і якой аддаў сваё сэрца, дзе клапатліва расціў свой сад — будаваў вёску Мацюшы і ўмацоўваў калгас «Зара». За 25 гадоў, на працягу якіх Давід Іванавіч кіраваў ім, калектыў гаспадаркі неаднаразова адзначаўся як адзін з лепшых. За добрасумленную працу Кахадзэ быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і медалём «За працоўную доблесць», меў мноства іншых грамат.

Давід Іванавіч любіў сваю сям'ю, аднавяскоўцаў, беларускія краявіды. Любіў сустракаць гасцей, частаваць іх за сваім сталом, любіў слухаць беларускія песні...

5 верасня 2006 года Давіда Іванавіча не стала. У апошні шлях яго праводзіла ўся вёска... Прайшло сем гадоў, як Мацюшы жывуць без гэтага шчырага, клапатлівага чалавека. Але аднавяскоўцы памятаюць свайго кіраўніка. Усё сапраўднае не забываецца.

Я і мае аднакласнікі сёлета заканчваем школу. Хутка мы апынемся перад выбарам: якім шляхам крочыць далей? Жыццё пакажа, кім кожны з нас стане, якую карысць прынясе сваёй Радзіме. Але мне хочацца верыць, што лёс Давіда Іванавіча Кахадзэ стане прыкладам аддання служэння зямлі і людзям і для маіх аднакласнікаў, і для тых, хто прачытае мой артыкул. Мне здаецца, што сёння нашай краіне вельмі не хапае такіх таленавітых кіраўнікоў, якія могуць павесці за сабой, захапіць ідэяй, і пайсці да канца, не зважаючы на цяжкасці і перашкоды. Такія людзі асвятляюць дарогу іншым...

**Вераніка КАЗАЧОНАК,**
**вучаніца 11 класа Мацюшэўскага дзіцячага сада—сярэдняй школы Полацкага раёна.**

**ПРА АЎТАРА**

***Нашаму аўтару 17 гадоў. Вераніка любіць спорт (раней займалася бегам, цяпер — валейболам). Шмат чытае мастацкай літаратуры, аддаючы перавагу рускім класікам. Колькі часу таму дзяўчына спявала ў гуртку пры вясковым Доме культуры, а сёння ёй больш падабаецца хадзіць на танцы разам з сяброўкай. Любіць слухаць музыку, асабліва — рэп.***

***— Збіраюся звязаць сваё далейшае жыццё з педагагічнай дзейнасцю, — сказала Вераніка. Дзяўчына падзялілася, што хоча паступіць у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка і ў будучым вучыць дзетак біялогіі і геаграфіі.***

Мы-такія!

# ПАД МАСКАЙ РАЗГЛЕДЗЕЦЬ АНЁЛА

**Людзі жывуць пачуццямі. Добра гэта ці не, але ўсе рашэнні мы прымаем, зыходзячы са свайго ўнутранага стану ў тую хвіліну, калі неабходна зрабіць крок у жыцці. І зараз маленькая Вера, што жыве ўнутры мяне, зробіць гэты крок. А вы, у сваю чаргу, будзеце плаваць у акіяне эмоцый і пачуццяў 16-гадовай дзяўчыны.**

Якая яна, сучасная моладзь?! Ведаеце, гэта вельмі складанае пытанне. Шчаслівая? Вясёлая? У нейкіх момантах — так, але ніхто не ведае, што часам стаіць за весялосцю і ўсмешкамі. Гэта ўсё маскі, за якімі не відаць маленькіх людзей, загнаных у кут, але не кожны зразумее гэта...

З чаго пачаць... Думаю, з дзяцінства Веры. Было яно шчаслівым, хоць у ім не было інтэрнэту, камп'ютараў і прыставак. Вось толькі не шанцавала з сябрамі: адны былі старэйшыя і не разумелі дзяўчынку, астатнія — смяяліся... Тады яна глядзела на неба, і перад яе вачыма плылі аблокі, а ўвесь цяжар і боль адляталі далёка-далёка. Яна размаўляла з небам, расказвала сваю гісторыю, дзялілася самым патаемным. І не было ў яе лепшага сябра, чым блакітны акіян над галавою. Вера падрастала, і спакой з гармоніяй бачыліся ёй ва ўсім: у дрэвах, птушках, кветках. Але ж галоўнае — неба...

Ішоў час. Дзяўчына пайшла ў сёмы клас, восьмы... Менавіта тады ў яе вачах свет пачаў мяняцца. Усюды людзі гаварылі толькі пра камп'ютары. Сёння кожны падлетак мае смартфон ці планшэт. Некаторыя дзеці, якія нават і гаварыць яшчэ не ўмеюць, тыкаюць у сэнсарны экран пальцамі і забіваюць намаляваных насякомых. Гульня, пра якую згадала, з маленства прывучае забіваць. Усе гэта я кажу не проста так. Калі мне было 9 гадоў, мы з сябрамі знайшлі дваіх кацянят, якім хтосьці выкалаў вочы. Памятаю таксама, як мы з маці ратавалі яшчэ адно кацяня, якога дарослыя хлопцы кідалі адзін аднаму, як мячык. На шчасце, гэтае кацяня — ужо дарослы кот Мацей, ён жыве ў мамінай сяброўкі, аднак тая жорсткасць бясследна не прайшла — у Мацея праблемы з лапамі.

Згадаю пра яшчэ адзін феномен, які перавярнуў наша жыццё. Гэта — інтэрнэт, сацыяльныя сеткі. Не маю нічога супраць таго, што клікам «мышы» мы можам знайсці любую інфармацыю, але якая яна — любая?! На кожным сайце прысутнічае рэклама з пазнакай 18+, большая частка дзяцей школьнага ўзросту бачыць яе менавіта ў той час, калі яны пазнаюць свет. І вось дзіця пазнае нешта «новенькае». І гэта новенькае — першы крок, першы ўзровень, калі пошасць уядаецца ў розум, а галоўнае, у душу дзіцяці. Сацыяльныя сеткі — гэта сапраўды сеткі, выйсці з якіх немагчыма, бо яны паглынаюць чалавека з галавой, пачынаюць кантраляваць яго паводзіны, думкі, жыццё.

Упершыню я зарэгістравалася ў сацыяльнай сетцы, мабыць, тры гады таму. Але перад тым, памятаю, дала сабе слова не рабіць гэтага, я была катэгарычна супраць. Аднак, калі бачыш, што ўсе так робяць...Чаму я — не ўсе?!

Пасля рэгістрацыі першыя месяцы тры была як зомбі. Увесь час сядзела каля камп'ютара, здаецца, не ела, не піла, проста (прабачце за слова) тупа глядзела ў манітор! Сацыяльная сеткі даводзяць падлеткаў да таго, што яны перастаюць чытаць, а рэальных зносін ужо не разумеюць. Для іх прасцей нешта напісаць у сетцы і такім чынам весці з іншым чалавекам гутарку. Па сабе ведаю: становіцца ўсё цяжэй размаўляць, больш камфортна маўчаць і проста націскаць на клавішы.

А ўся тая рэклама, пра якую казала раней, — як яна ўплывае на падлеткаў? Дзяўчаткі пачынаюць паводзіць сябе ўжо не як будучыя лэдзі. І ўсё толькі дзеля таго, каб прыцягнуць увагу да сваёй асобы з боку хлопцаў. А тыя, у сваю чаргу, карыстаюцца момантам, і «лэдзі» ў іх руках — марыянетка, з якой можна рабіць усё, што пажадаеш. Падлетак часта мацюкаецца не таму, што яму падабаецца, а робіць гэта, каб вылучыцца, пакрасавацца. І гэта ўсё — ад адзіноты. Сацыяльныя сеткі заблакавалі нармальнае жыццё, і менавіта гэта нараджае пустату ў сэрцах маладых людзей, якую яны хаваюць пад маскамі. Ад адзіноты падлеткі пачынаюць шкодзіць іншым, цкаваць слабейшых.

Мы з вамі ў кругавароце, з якога трэба выйсці. А каб выйсці, неабходна правесці над сабой вялікую працу. Спадзяюся, што дарослыя, бацькі, ды і сама моладзь дастукаюцца да маленькага анёла ўнутры кожнага, які загнаны ў кут і якому трэба дапамога.

❍ ❍ ❍

Нехта можа сказаць пра мае думкі — глупства. Я не пакрыўджуся. Адзінае, яшчэ раз хачу нагадаць: мы жывём пачуццямі, і ўсе вышэйсказанае — мой погляд на рэчаіснасць. Не буду ўтойваць: у розныя перыяды і я па-рознаму гляджу на свет. І гэта нармальна. Жыццё складанае, але цікавае і прыгожае, і трэба ўмець жыць.

**З ПРЫПАВЕСЦІ**

«У кожным чалавеку ўнутры жывуць два ваўкі. Адзін добры, а другі — злы. Паміж імі заўсёды ідзе барацьба. Добры воўк заўсёды імкнецца абудзіць у чалавеку ўсе лепшыя рысы. Дабрыню, міралюбства, надзейнасць, вернасць... А злы воўк таму і завецца злым, што заўсёды стараецца ў сэрцы чалавека абудзіць зайздрасць, рэўнасць, эгаізм, агрэсію, нянавісць. А да каго — яму ўсё роўна. Паміж гэтымі двума ваўкамі ідзе барацьба на працягу ўсяго жыцця чалавека. І хтосьці з іх павінен перамагчы. Каторы? Пераможа той воўк, якога ты будзеш карміць...».

**Вера КАНОПСКАЯ,**
**вучаніца 10 класа гімназіі №7 г. Маладзечна.**

**ПРА АЎТАРА**

***— Я люблю маляваць — восем гадоў вучылася ў гімназіі-каледжы мастацтваў. Гэта лепшы варыянт для мяне адпачыць і прывесці ў парадак свае думкі, — расказвае пра свае захапленні 15-гадовая аўтар. — Яшчэ люблю чытаць, але, на жаль, на гэта не хапае часу, бо шмат урокаў і трэба рыхтавацца да ЦТ. Але я ўсё роўна спрабую знайсці час для чытання. Яшчэ вельмі люблю музыку. У маім плэеры шмат песень, і не мае значэння, рок гэта ці поп, джаз ці класіка.***

***Вера спадзяецца паступіць ва ўніверсітэт сваёй мары (у які — так і не прызналася). «Не таму, каб атрымліваць вялікія грошы, а каб займацца тым, што падабаецца. Усім сэрцам хочацца верыць, што ў будучым я захаваю гармонію ўнутры сябе, павандрую і буду проста чалавекам — з вялікай літары».***

# САПРАЎДНЫ РЫЦАР!

**Шмат гадоў таму, калі дзеці яшчэ не ведалі, што такое айфон, айпад і Джасцін Бібер, наш герой сплёў кальчугу. Рабіў ён яе з дроту доўга і ўпарта — цэлы год. Юнацкае захапленне гісторыяй перарасло ў прафесію. Цяпер Віктар Эдуардавіч Жук — настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 11 горада Маладзечна.**



Віктар ЖУК.

Мы заўсёды з задавальненнем наведваем яго ўрокі, бо гэта не проста 45 хвілін «сухога» тэксту з падручніка, а цікавы і пазнавальны дыялог. Педагогу ёсць чым падзяліцца з намі. Ужо дзесяць гадоў Віктар Эдуардавіч удзельнічае ў ваенна-гістарычных рэканструкцыях, з'яўляецца ўдзельнікам гістарычнага руху і членам клуба «Тун», які займаецца рэканструкцыяй зброі і амуніцыі швейцарскай пяхоты XIV-XV стагоддзяў. «Сярэднявечны воін» мае свае даспехі, касцюмы і зброю. Штогод ён прымае ўдзел у розных мерапрыемствах міжнароднага фармату, гістарычных фестывалях, пастановачных, у тым ліку і масавых, бітвах.

У сям'і Віктара Эдуардавіча, акрамя яго самога, ёсць яшчэ гісторыкі: сястра — кандыдат гістарычных навук, этнолаг, а яе муж — доктар асірыялогіі (навука, якая вывучае мовы, пісьменства, культуру і гісторыю Асірыі, Вавілоніі і Месапатаміі).

— Мой лепшы сябар — малодшы навуковы супрацоўнік Акадэміі навук, археолаг. Дзякуючы яму я трапіў на раскопкі старажытных гістарычных месцаў, — з захапленнем распавядае настаўнік. — Вы не ўяўляеце, якія пачуцці адольваюць, калі ўласнымі рукамі датыкаешся да гісторыі, знайшоўшы ў зямлі астанкі нашых продкаў!

**ПРА АЎТАРА**

***Вікторыя любіць свойскіх жывёл і птушак. Любімы прадмет у школе — гісторыя. Шмат чытае, перавагу аддае беларускай літаратуры, выбіраючы класіку. У будучыні хоча стаць бухгалтарам. Прынамсі, першая адукацыя будзе эканамічнай. Апошняе захапленне — журналістыка. Чаму? «А вось захацелася!» — тлумачыць дзяўчына прычыну гэтага цалкам самастойнага кроку. Таму з нядаўняга часу яна наведвае школу журналістыкі «Маладзік» пры Маладзечанскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі.***

***Гэта дэбютны матэрыял 15-гадовай Вікторыі. Нам думаецца, што ён стаў удалым.***

Віктар Эдуардавіч — малады педагог, які працуе ў школе толькі два з паловай гады. Але ён лічыць гэта сваёй перавагай:

— Я ведаю, якую музыку слухаюць мае вучні, якія фільмы яны глядзяць, чым яны дыхаюць. Як і многія хлопчыкі, люблю гуляць у футбол. Трымаю сувязі са сваімі падапечнымі ў сацыяльных сетках. Усё гэта дапамагае мне знайсці агульную мову з вучнямі, у гэтым і ёсць мой прафесійны сакрэт.

Віктар Эдуардавіч лічыць, што настаўнік павінен быць адданы справе, якой ён займаецца, а яшчэ — быць камунікабельным, крэатыўным, мабільным, крочыць у нагу з часам. Усе гэтыя рысы характару дапамаглі маладому педагогу стаць нядаўна пераможцам абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года», дзе ён паўстаў у вобразе «сярэднявечнага воіна», годна прадставіўшы свой досвед у творчым этапе і падчас адкрытых урокаў і майстар-класаў.

— Такога выніку дамагчыся я не здолеў бы без дапамогі творчай групы выкладчыкаў нашай кафедры на чале з намеснікам дырэктара Галінай Пятроўнай Пішчык, — з удзячнасцю падкрэслівае педагог. — Мне даводзілася ўдзельнічаць у розных конкурсных мерапрыемствах. І паколькі я прысутнічаў амаль на ўсіх міні-ўроках сваіх калег, то запазычыў для сябе шмат новых ідэй і знаходак.

У хуткім часе яны сапраўды спатрэбяцца педагогу. Зычым Віктару Эдуардавічу поспехаў у фінале рэспубліканскага конкурсу!

**Вікторыя ПАЖЫГАЙЛА,**
**вучаніца 9 класа СШ № 11 г. Маладзечна.**

# САМАЯ ЛЕПШАЯ!

**Я хачу расказаць вам пра сваю маму Ларысу Міхайлаўну. Калі б вы ведалі, як я яе паважаю і люблю! Яна заўсёды клапоціцца пра нас з братам. Дапаможа зрабіць урокі, растлумачыць, падкажа. Мы заўсёды адчуваем цеплыню яе рук, дабрыню сэрца. Для нас яна і добры дарадчык і лепшы сябар. Асабліва мне падабаецца ў ёй тое, што яна ніколі не бывае ў дрэнным настроі. Гэта энергічны, жвавы, вясёлы і вельмі аптымістычны чалавек. Маці ў нашай сям'і як батарэйка, ад якой мы ўсе зараджаемся жыццялюбствам і дабрынёй.**

А працуе яна кіраўніком сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва. Усе, хто звяртаецца да яе з просьбай, застаюцца задаволенымі, бо яна кожнаму дасць параду, дапаможа, падкажа правільнае рашэнне.

Да людзей мама ставіцца з павагай, ніколі не бывае пагардлівай. Яна вельмі адказны чалавек. Калі штосьці паабяцае, то заўсёды зробіць. І што яшчэ ў ёй адметнае — яна ніколі не сядзіць на месцы і не чакае «манны нябеснай». Заўсёды дабіваецца ўсяго сама. Кожную справу даводзіць да канца. У аднавяскоўцаў карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Нядаўна яе яшчэ раз абралі дэпутатам раённага Савета. Гаспадарка, якую яна ўзначальвае толькі чатыры гады, ужо займае першае месца ў раёне па ўсіх паказчыках. Летась маці адна з раёна ездзіла на «Дажынкі» як лепшы кіраўнік. Чаму ж мне не ганарыцца ёю?! Ды я і сам, калі скончу школу, хачу працаваць на зямлі, можа, у будучым, і кіраўніком гаспадаркі — як маці.

Чаму ў яе ўсё так добра атрымліваецца? Думаю таму, што мая маці да ўсяго ставіцца з душой, з поўнай самааддачай.

Было б добра, каб у нас стала больш такіх людзей, якія ніколі не чакаюць міласці ад Бога, а самі, сваімі рукамі робяць добрыя справы, дабіваюцца пэўных вынікаў і заўсёды ведаюць, што праца — вялікая сіла. Самаадданасць — гэта адна з самых адметных рыс характару маёй маці. Вера ў людзей і ў лепшае будучае дапамагае ёй пераадолець усе цяжкасці і з радасцю сустракаць новы дзень.

**Павел ПАСЯЛЕНЦАЎ,**
**вучань 9 класа**
**Шаламоўскай базавай школы**
**Слаўгарадскага раёна.**

**ПРА АЎТАРА**

***Павел любіць чытаць, аддае перавагу фантастыцы і творам пра каханне. Сябруе з камп'ютарам. Гуляе ў футбол, захапляецца шашкамі і шахматамі. Паколькі жыве ў вёсцы, шмат што можа змайстраваць сваімі рукамі. Напрыклад, наш аўтар атрымаў дыплом першай ступені на раённым конкурсе за выробленую з дрэва фігурку выратавальніка. Цікавіцца тэхнікай: матацыкламі, машынамі. Кім хоча стаць у будучым?***

***— Як і напісаў у творчай працы, хачу пайсці ў сельскагаспадарчую ўстанову адукацыі, — упэўнена адказаў 15-гадовы Павел.***

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
15 05 2014 г.

*Убачыць сябе, сапраўднага*

# ЯЛІНКА, ШТО ВЕРШАМІ КРАНАЕ

**На філфаку вучыцца шмат маладых паэтаў, але Ялінку Агрэніч я заўсёды чытаю з асаблівым задавальненнем, таму што ў яе вершах пазнаеш сябе.**

***— Ялінка, з чаго пачалася твая творчасць?***

— Напэўна, яшчэ не так хутка, як бы мне хацелася, я змагу назваць тое, што пішу, паэзіяй. І тут не ідзе гаворка пра маю нейкую там звышсціпласць. Проста, перачытаўшы мноства вершаў розных паэтаў, я сабе дастаткова яскрава ўяўляю, ЯК можна пісаць. Першыя рыфмаваныя радкі былі прадстаўлены ўвазе маіх бацькоў, калі мне было гадоў 8. Яны мяне выслухалі і абсалютна не рагаталі ні падчас дэкламавання, ні пасля: варта адзначыць, я больш дбала пра форму верша, а не пра яго змест.

***— А каму ці чаму ты прысвячаеш свае творы?***

— У мяне дагэтуль захаваўся маленькі самаробны зборнік маіх наіўных рускамоўных «вершаў». Мілы верш пра маму, «ода» работнікам МНС у лепшых традыцыях савецкіх аўтараў (у конкурсах жа ўдзельнічала) і іншае. Карацей, пісала па замовах *(усміхаецца)*. А ў гадоў 13 я павесіла аловак з нататнікам «на цвік»... Перыяд творчасці «ранняй Агрэніч» паспяхова скончыўся. Другая хваля накаціла, калі ўпершыню патрапіла на абласную алімпіяду па беларускай мове і літаратуры. У змрочным пакойчыку інтэрната Дзяржынскага прафесіянальнага ліцэя нарадзіўся верш «Свечка». Гэта быў верш на беларускай мове. І тут я ўрэшце канчаткова ўсвядоміла: дык па-беларуску ў мяне атрымліваецца значна лепш пісаць! І пайшлі вершы пра паэта і паэзію, нацыянальнае адраджэнне, мужнасць і годнасць чалавека. Вельмі міла перачытваць гэта ўсё ці выпадкова знаходзіць дзесьці аркушы паперы з вершамі таго часу. Потым характар маіх вершаў змяніўся разам са зменамі, што адбыліся ў маім жыцці, і новымі інтарэсамі.



***— Адкуль бярэцца натхненне?***

— Уладзімір Караткевіч сцвярджаў, што верш пачынаецца з думкі, са слова, прычым тое слова можа быць вырваным з пачатку, з канца, з сярэдзіны верша. І гэта абсалютная праўда. Памятаю, як заўсёды хацела напісаць верш, дзе будзе слова «хмарачос». Хоць і калька чыстай вады, але люблю я гэтае слова! А потым, чакаючы на вуліцы Кірава тралейбус, заўважыла, як адзін будаўнік на даху супрацьлеглага дома, які рамантаваўся ў той час, неяк задумена паглядае навокал, абапіраючыся на агароджу. Ён зняў рукавіцы і проста атрымліваў асалоду ад таго, што бачыць. У аўтобусе я пачала занатоўваць гэты эпізод і з радасцю і са здзіўленнем зразумела, што нарэшце магу ўжыць слова «хмарачос». Карацей, ніколі не ведаеш, як менавіта народзіцца верш...

***— Хто твой любімы пісьменнік? Чаму менавіта?***

— Маімі любімымі паэтамі з'яўляюцца два Уладзіміры Сямёнавічы — Высоцкі і Караткевіч. Яны акурат з кагорты тых творцаў, якія даюць магчымасць зразумець, што я — не паэт абсалютна. А з польскай літаратуры вельмі падабаецца Віслава Шымборская. Некаторыя яе вершы патрабуюць неверагодных інтэлектуальных высілкаў, каб іх зразумець.

***— Што пажадаеш маладым творцам?***

— Пішыце і атрымлівайце задавальненне ад гэтага працэсу. Нават калі вы не бачыце ў сабе вялікага таленту (я з кагорты такіх людзей), пішыце, бо вашы вершы потым стануць найлепшымі дзённікавымі запісамі. Прычым фіксавацьяны будуць не столькі падзеі, колькі вашы думкі ў пэўныя моманты жыцця і ваш светапогляд увогуле. Удачы!

**Анастасія ЖУХАРАВА,**
**студэнтка ІІ курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**

## ПРА СТОМЛЕНАСЦЬ ПАПЯРЭДЗЯЦЬ... АКУЛЯРЫ

**Японская кампанія оптыкі распрацавала і рыхтуе да вытворчасці акуляры, здольныя вызначаць ступень стомленасці свайго ўладальніка.**

Тры сэнсары, устаноўленыя на аправе, здымаюць паказчыкі частаты міргання і фіксуюць змяненні электрычнага патэнцыялу сятчаткі і вочных мышцаў пры рухах вочнага яблыка. Атрыманая інфармацыя пры дапамозе Bluetooth 4.0 перадаецца на планшэт або смартфон, а затым спецыяльны дадатак паведамляе праператамленне і неабходнасць адпачынку падчас працы за камп'ютарам або рэкамендуе кіроўцы спыніць машыну, калі яго пачынае адольваць сон.

Дадатак да акуляраў будзе сумяшчальны з аперацыйнымі сістэмамі Windows, Macintosh, iOS і Android. Убудаваный у акуляры батарэйкі хапае на восем гадзін, важыць яна 36 грамаў. Акуляры паступяць у продаж вясной 2015 года. Рознічная цана пакуль не называецца. Восенню абяцаюць прадставіць інтэрфейс праграмавання дадаткаў.

Цікава, што знешні від акуляраў быў распрацаваны стваральнікам мадэлі аўтамабіля Audi A6 Сатосі Вадой.

Па ацэнках экспертаў, да 2020 года ў Японіі будуць прадавацца ў год каля 6 мільёнаў падобных прыстасаванняў, сумяшчальных з планшэтамі і смартфонамі.

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»**

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов»**

| Лот | Объект | Адрес | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Автомобиль ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР номер рамы WV2ZZZ7HZ5H075138 | Адрес: г. Минск, ул. Шатько, 24 | 170 000 000 | 17 000 000 | 1% |

Тип ТС – грузопассажирский вагон. Год выпуска – 2005. Полная масса – 3 000 кг. Цвет – зеленый. Пассажирских мест – 7. Комплектация – базовая. КПП – механическая. Объем двигателя – 1896 см³ (турбодизель). Пробег по одометру – 223 563 км. Количество осей – 2. Автомобиль имеет незначительные дефекты эксплуатации.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 6% (шести процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 17.06.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; физ.лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Объединенная дирекция строящихся объектов», проводимом 17 июня 2014 г.*

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений 13.06.2014 в 12.00. Заключительная регистрация участников **17.06.2014 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Максименко Валерий Борисович 8 (044) 783-47-09.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять Объект (Лот) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**

*Праект для ўсіх*

## ХОЧАШ У ВЕНЕЦЫЮ? БЕЗ ПРАБЛЕМ!

### Ліга добраахвотнай працы пашырае магчымасці

**Мінула ўжо дваццаць гадоў з дня ўтварэння рэспубліканскай маладзёжнай грамадскай арганізацыі «Ліга добраахвотнай працы моладзі», якая па-ранейшаму дапамагае рэалізоўваць свае ідэі і ініцыятывы, заснаваныя на прынцыпах добраахвотных, нефармальных і міжкультурных зносін. Калі ў цябе ёсць такія, то смела можаш ісці ў галоўны офіс Лігі і «рухаць» сваю задуму, а арганізатары праекта зробяць усё магчымае, каб увасобіць яе ў жыццё. Таксама ты можаш выдатна правесці час у творчых майстэрнях, педагагічных атрадах і міжнародных летніках.**

— Ліга — не штучная арганізацыя. У нас кожны супрацоўнік прыносіць свае ідэі, настрой і ў выніку атрымліваецца рознакаляровы «дыван ручной работы», — падкрэслівае старшыня праўлення арганізацыі Вольга Шмігельская.

Калі ты хочаш быць у эпіцэнтры падзей, то ў Лізе цябе чакаюць з распасцёртымі абдымкамі. Вопыт працы не патрабуецца, а вось добры настрой і кемлівасць вітаецца. У арганізацыі кожны зможа знайсці сябе і сваё прызванне, адпачыць і навучыцца рабіць сваімі рукамі цудоўныя рэчы.

— Напрыклад, арт-клуб «Clever» не абміне творчых і цікавых людзей, якія любяць ствараць новае ці рабіць нечаканыя падарункі для сваіх сяброў і блізкіх. Што гэта можа быць? Выбар вялікі: малюнак на тканіне, рэчы з лямцу, мыла. «Застаецца выбраць на афіцыйным сайце Лігі тое, што табе цікава, абавязкова зарэгістравацца і прыехаць на сустрэчу ў прызначаны дзень», — патлумачыла Вольга Шмігельская.

Не менш папулярным сярод моладзі застаецца студэнцкі педагагічны атрад «Resпублика». Студэнты штогод выязджаюць за мяжу ў якасці важатых, фізрукоў, дыджэяў, музычных кіраўнікоў. Каб трапіць у лік такіх «шчасліўчыкаў», трэба адпавядаць прынамсі тром крытэрыям. Узрост удзельнікаў вагаецца ад 18 да 30 гадоў. Каб папоўніць шэрагі педагагічнага атрада, неабходна прайсці кастынг (запоўніць анкету кандыдата, даведацца пра час і месца правядзення кастынгу), затым прайсці навучанне ў Школе важатых, здаць экзамен і сабраць «чамадан важатага» для незабыўнай вандроўкі.

Ліга добраахвотнай працы адкрывае перад моладдзю межы. Вось, напрыклад, хачу паехаць у Францыю, Італію або Германію... «Калі ласка, без праблем!» — адказалі мне супрацоўнікі Лігі. А ўсё таму, што ў Лігі ёсць адпаведны праект. «Workcamp» — гэта міжнародныя валанцёрскія летнікі ў Еўропе. У праекце бяруць удзел 15-20 валанцёраў з розных краін (з адной — максімум два валанцёры), на працагу двух-трох тыдняў маладыя людзі разам працуюць, знаёмяцца з асаблівасцямі краіны, заводзяць новыя знаёмствы. Веданне базавага ўзроўню англійскай мовы абавязковае, таму гэта яшчэ і выдатная магчымасць «падцягнуць» мову. Ліга супрацоўнічае з 43 арганізацыямі з 35 краін свету, значыць, кожны, хто прыйшоў у арганізацыю, можа выбраць цікавую краіну, пачынаючы з ЗША і заканчваючы Манголіяй. Ёсць сацыяльныя віды працы (з дзецьмі, інвалідамі), экалагічныя (пасадка дрэў, прыбіранне смецця), рэстаўрацыйныя (гэта, вядома ж, не рэстаўрацыя сабора Парыжскай Божай Маці, але абяцаю, што падыход да адраджэння будынка будзе крэатыўны і цікавы), і, нарэшце, музычна-тэатральная праца. Праўда, тут ёсць некалькі «але» — гэта ўзроставыя абмежаванні, як ужо адзначалася вышэй, веданне англійскай мовы альбо мовы выбранай краіны, і матывацыя. Пражыванне і харчаванне на тэрыторыі замежнай краіны бясплатнае, а вось за дарогу давядзецца заплаціць са свайго кашалька (сума залежыць ад адлегласці і выбранага транспарту). Наглядны прыклад: дарога у Францыю або Германію каштуе 150-200 еўра, членскі ўнёсак у Лігу — 350 тысяч рублёў плюс грошы на кішэнныя выдаткі (у большасці выпадкаў віза даецца бясплатна).

На гэтым праекты ў Лізе добраахвотнай працы моладзі не заканчваюцца, а толькі пачынаюцца: міжнародныя валанцёрскія летнікі ў Еўропе, еўрапейская валанцёрская служба, міжнародны валанцёрскі лагер «Блакітны» і яшчэ шмат разнастайных праграм па інтарэсах. У арганізатараў Лігі добраахвотнай працы моладзі шмат планаў, ідэй і пажаданняў на будучыню. Бліжэйшы з іх — стварыць праект з іншымі сацыяльнымі арганізацыямі крэатыўныя лаўкі і ўсталяваць іх у парках адпачынку, бо, як вядома, іх шмат не бывае. Знойдзецца праект як для сарамлівай дзяўчыны, так і для смелага, рашучага хлопца. Ліга пашырае межы — у моладзі ёсць выдатная магчымасць убачыць свет і стаць самастойнымі і адказнымі людзьмі.

**Эльвіра ГАРОШКА.**

**УВЕДОМЛЕНИЕ акционеров ОАО «АМКОДОР – БЕЛВАР» ОБ ИХ ПРАВЕ ТРЕБОВАТЬ ВЫКУП АКЦИЙ**

7 мая 2014 года внеочередным общим собранием акционеров Открытого акционерного общества «АМКОДОР – БЕЛВАР», находящегося по адресу: 220005, город Минск, проспект Независимости, 58, принято решение о реорганизации ОАО «Амкодор-Белвар» путем присоединения к нему частного унитарного производственного предприятия «Амкодор-Квадранит». Акционеры общества, которые не участвовали в данном собрании акционеров или голосовали на данном собрании акционеров против принятия решения о реорганизации ОАО «Амкодор-Белвар» путем присоединения к нему частного унитарного производственного предприятия «Амкодор-Квадранит», вправе требовать выкупа обществом принадлежащих им акций общества. Утвержденная собранием акционеров цена выкупа акций: 76 700 рублей за одну акцию. Срок подачи акционерами заявлений с требованием о выкупе акций с 8 мая 2014 года по 26 июня 2014 года. Срок удовлетворения обществом требований о выкупе акций (заключения договоров купли-продажи) с 27 июня 2014 года по 26 июня 2015 года. Выкупленные обществом по требованию его акционеров акции подлежат аннулированию. Прием требований акционеров о выкупе акций и последующее заключение договоров купли-продажи акций осуществляется по адресу: город Минск, проспект Независимости, 58, каб. № 407 на 4-ом этаже заводоуправления в рабочие дни с 8.00 до 16.40, обеденный перерыв с 12.00 до 12.40.

Тел. для справок (8-017) 293-97-82.

УНП 100363840

*Совет директоров ОАО «Амкодор – Белвар»*

*Дзённік першакурсніцы*

# ПЕРАЖЫЦЬ САМУЮ ЦЯЖКУЮ СЕСІЮ Ў ЖЫЦЦІ,

## або Місія выканальная!

*24/12/13*

...Прачнулася рана. Па дарозе ва ўніверсітэт набываю «Звязду» з «Чырвонкай». Так нецярпелася паглядзець, ці надрукавалі мой матэрыял! Дзень складаўся толькі з дзвюх дысцыплін. На першай была кантрольная па тэме «Фанетыка». Да чаго ж я не люблю яе яшчэ са школы!..

...Збіраю рэчы ў сумку. Кітаянкі пазаздросцілі, што паеду дамоў.

*30/12/13*

Вяртаемся ў Мінск. Сёння дадатковыя заняткі па рускай мове — трэцяй парай. Група ў поўным складзе была ўжо перад другой. Такое не часта здараецца. Да ўніверсітэта мяне падвёз тата, і так атрымалася, што пасля заняткаў я мяняла кола аўтамабіля. З'ява нармальная, але, напэўна, не для кожнай дзяўчыны...

*02/01/14*

Каля інтэрната каленам «апрабавала» лёд. Каўзанулася па ім па звычцы, ды яшчэ і з дарожнай сумкай... І закон зямнога прыцягнення не прымусіў сябе чакаць — выпусціла з рук ноўтбук. На першы погляд ён здаўся «жывым», але я адразу чамусьці здагадалася, на што пойдзе стыпендыя. Паломка была...

*05/01/14*

Заўтра першы экзамен — «Эканоміка». Ужо трэці дзень запар з ёю змагаюся. Стан такі, што хочацца плакаць. Якраз да часу мая чарга дзяжурыць па блоку. Калі нервы здаюць — змяняю дзейнасць.

Мару прачнуцца 25 студзеня з усімі здадзенымі іспытамі. Эх...

*06/01/14*

Не такія і страшныя тыя іспыты, як чаканне іх вынікаў. Час з 8.30 да 17.30 правялі ва ўніверсітэце. З іх толькі дзве гадзіны пайшлі на сам экзамен. Паспелі пасядзець, пахадзіць, пагуляць у «ногі», схадзіць на кансультацыю... Мая адзнака — станоўчая. Камень з плеч. Падлічыла — сёння здавала 21-ы і 22-і экзамены ў маім жыцці. Неверагодна. Доўгачаканы адпачынак. Сон, які заўсёды дапамагае пасля іспытаў, не прыходзіў...



Бавім час на перапынку.

*07/01/14*

Суседкі сталі цішэйшымі, менш дакучлівымі і, здаецца, разумеюць, чым быў выкліканы мой гнеў некалькі дзён таму (нарэшце!). Так, яны добрыя, вясёлыя, але прыбіраць кухню (і не толькі яе) пасля сябе звычкі не маюць...

*08/01/14*

Зваць «халяву» напярэдадні экзамену ў 00.00 і атрымаць надзею на лёгкі білет, і даць веры ў свае сілы — студэнцкая завядзёнка. Нават праз зачыненае вакно чуваць. Усміхаюся...

*10/01/14*

Экзамен. Першыя слёзы. Вось гэтага не чакала зусім. Ну, напэўна, такое правіла: вучы ўсе пытанні, нічога не прапускай. Бо калі ты прапусціш, менавіта на тое і давядзецца адказваць. Злуюся толькі на сябе. Дзень не прынёс нічога добрага і пазітыўнага. Сон, толькі ён ратуе.

*15/01/14*

Збілася з рэжыму. Кнігі захапілі так, што часу не заўважала. Да таго ж трэба колькі гадзін адпачыць перад паходам у рэдакцыю. І не праспаць.

У рэдакцыі «Чырвонкі» спадабалася. І цеплыня, з якой мяне сустрэлі, нават засмучала. Шмат пазітыўных эмоцый. Хацелася тварыць. Прааналізавала ўсё, цяпер думаю, што сказала б іншае.

...То нічога, то ўсё адразу. Першыя паклоннікі. «Добры дзень! Прачытала ваш артыкул. Думаю, што з вамі будзе цікава пагутарыць». Прыемна, што людзей нейкім чынам кранае.

Вечарам дапамагала Чжу Чжу і Лілі Бо (так завуць маіх суседак) з выкананнем практыкаванняў па рускай мове. Гэта ўжо само сабой, як частка жыцця.



Здымачны працэс.

*16/01/14*

Не разумею, што за кніга. Да таго мяне вабіць, што адарвацца амаль немагчыма. Раздзел за раздзелам. Ранак. Каля 5 гадзін. Вочы зліпаюцца.

Прыехалі суседкі па блоку. Ніколі не была ім так рада. Прычына: кітайскай мовы апошнім часам было для мяне зашмат.

*17/01/14*

Чысты пакой, парадак на палічках і смачны абед. Усё так спраўна робіцца, толькі б не разгортваць канспекты і не вучыць. Бліжэй да вечара прымусіла сябе прайсціся па экзаменацыйных пытаннях (беларускамоўныя тэксты). Выконваю расклад: 20 хвілін вучу, 10 адпачываю.

*20/01/14*

Раніцай выпадкова мой будзільнік пабудзіў суседак. Запаліла святло над імі. Усяго на 5 хвілін! А потым я здзіўлялася, чаму яны больш не вучаць мяне кітайскай мове?

Упершыню за ўвесь час сесіі ішла на іспыты з добрым настроем і «свежай» галавой.

Вось дык пашанцавала! Для многіх гэтае пытанне — цяжкае, для некаторых — простае. Выцягнула білет, атрымала практычнае заданне і... «Каму асаблівасці гуку?» Мне! «Каму фанетыку і фанемы?» Мне! «Каму транскрыпцыю?» Мне-мне-мне!

*21/01/14*

Тры дысцыпліны — тры дні. Нарэшце прызвычаілася да тэмпу сесіі, і размеркаванне часу цяпер — не праблема. Вечарам абавязковая прагулка, і не мае розніцы, якое надвор'е.

Паснедалі з суседкамі. Не думала, што бліны, начыненыя кансерваванымі агуркамі, пасераванай морквай і сырам, могуць быць такімі смачнымі.

*22/01/14*

Адчуваю, што сесія мяне пакрысе «з'ядае». Доўгі сон, слабасць, раздражняльнасць... Засынаю, чытаючы філасофію. Адкрываю педагогіку, пішу план-канспект. Пераходжу на псіхалогію і — засынаю...

Дапамагаю з практыкаваннямі кітаянкам. Ужо другі месяц з імі, нейкія зрухі ёсць. І тут адна з іх пытаецца: «What is your name?»... («Як цябе завуць?»)

*24/01/14*

Свежая галава. Сон — тры гадзіны. І не таму, што вучыла, а таму, што нервавалася. Што сказаць, «мой» дзень. Сесія амаль закрытая. Адна пераздача. І менавіта той дысцыпліны, да якой рыхтавалася больш за ўсё. Адчыніла дзверы аўдыторыі — і ўсё нібыта выпарылася з галавы... На стыпендыю асабліва не разлічвала, а цяпер яе дакладна не будзе. Шкада...

*26/01/14*

Першакурснікі прайшлі абрад пасвячэння ў студэнты. Калі вучылася ў каледжы, я не адчувала сябе ні студэнткай, ні першакурсніцай. Аднак цяпер магу сказаць, што гэта самая цяжкая сесія ў маім жыцці. Змагаліся да апошняга, пасябравалі і больш палюбілі адно аднаго, і не толькі групай, а цэлым патокам.

Вечарам схадзіла на канцэрт маладой групы «Назіральнік». Апынулася ў некім загіпнатызаваным стане. Усё б нічога, але вучоба не дрэмле, і матэрыял трэба «штурмаваць».

*28/01/14*

Усё, атрымалася! Пайшла першай, пашчасціла з білетам, здала. Засталася на некалькі гадзін, каб падтрымаць аднагрупнікаў. З розных бакоў ідуць размовы пра пераздачы, у каго колькі.

*30/01/14*

Падводжу вынікі. За тры тыдні я здала 9 іспытаў, спісала каля 120 старонак, прачытала 6 кніг мастацкай літаратуры, 15 кніг — па дысцыплінам, прагледзела каля 20 фільмаў, праспала каля 124 гадзін (з 504 магчымых), прайшла больш за 63 000 крокаў. Цяпер адпачываем.

*12/02/14*

...Па раскладзе — тры пары англійскай. Адчуваю сябе як выціснуты лімон.

*16/02/14*

Усё ніяк не адважуся схадзіць у басейн. Лянотай гэта не назаву, у мяне больш страху.



Сшытак суседак.

Плаваць не ўмею і, што самае прыкрае, не хаджу вучыцца.

*24/02/14*

Сюрпрызаў не меншае. Яны толькі набіраюць абароты. У нашай групе папаўненне — новыя аднагрупнікі. Тут магу сказаць наступнае — яны мяне перасядуюць гэтыя маладыя людзі з Кітая.

*10/03/14*

Салодкага многа не бывае? Як высветлілася, бывае. Удзень хлопцы з групы арганізавалі нам салодкія пасядзелкі. Вечарам сяброўка частуе тортам. Нікуды не дзецца. Нельга так здзекавацца з арганізма. За дзень толькі раз паела здаровай ежы.

*14/03/14*

Сумяшчаю прыемнае з карысным. Сяброўка вельмі любіць катацца на роліках, а мне трэба зрабіць серыю фотаздымкаў на тэму здаровага ладу жыцця моладзі. Пасля трохдзённага сядзення за камп'ютарам нарэшце заўважаю па-сапраўднаму вясновае надвор'е.

*24/03/14*

Ніколі не чытайце старажытную беларускую літаратуру пасля таго, як паслухаеце Высоцкага! Тое, што ў галаве робіцца потым, словамі не апісаць.

*25/03/14*

Запар дзве літаратуры. «Ноў комент», як той казаў. Замежная літаратура радуе з кожным разам усё больш і больш. Абавязковы паход у бібліятэку. За чытаннем не паспяваю сачыць за часам. Сну мяне могуць пазбавіць толькі дзве рэчы — напісанне матэрыялу і цікавая кніга. Добра ці дрэнна, але ўсё так і ёсць.

*26/03/14*

Замест факультатыву па англійскай мове схадзіла на сустрэчу з Георгіем Калдуном. Не кожны дзень такія цікавыя людзі прыходзяць да нас на факультэт. Высветлілася, што не толькі я з групы зрабіла выбар не на карысць замежнай мовы. Але тры гадзіны — перабор.

*27/03/14*

Вось ужо амаль тыдзень, як у кітаянак з'явілася шыншыла. Не магу сказаць, што рада. Аднак гэта куды лепш, чым хамяк. Шуму ноччу амаль няма.

*29/03/14*

Была на фестывалі факультэтаў БДУ. Уразіла настолькі, што захацела паступіць ва ўніверсітэт яшчэ раз. Атрымала квіток на 1/8 фіналу КВЗ Белдзяржуніверсітэта. Вечар прайшоў у ліцэі БДУ. Пазітывам забяспечылі сябе на некалькі дзён наперад.

*30/03/14*

Падрыхтавала прэзентацыю па фатаграфіі, а потым ад стомленасці і рассеянай увагі націснула на «Не захаваць»... Слоў не знайшлося, каб апісаць эмоцыі. Патраціўшы амаль увесь дзень і выканаўшы большую палову заданняў, вырашаю легчы спаць.

*1/04/14*

Дзень па праве можна залічыць да лепшых. Група ажывілася. Перапынкі з жартамі, семінары — з ведамі. Выпуск вучэбнай газеты сёння асаблівы. Урэшце мы дайшлі да таго самага моманту, калі трэба вызначацца з кірункам, назвай выдання. Не адна спрэчка нас чакае...

Вечар быў патрачаны на падрыхтоўку відэа «Журналісцкага расследавання» да пары англійскай мовы. Ух, што атрымалася!

*3/04/14*

Дзень, калі ўсё валіцца з рук. Самыя сумныя і нудныя пары. Нечакана адна свабодная. Збор з нагоды хуткага высялення з інтэрната. Як ні сумна, але са звыклага пакоя ў сувязі з падрыхтоўкай да правядзення чэмпіянату свету па хакеі трэба высяляцца. Другі раз за год перасяляюся. Добра, што на гэты час прадстаўляюць месца.



У чаканні вынікаў першага экзамену.

**Кацярына ЛЯСУН.**
**Фота аўтара.**

**АД РЭДАКЦЫІ**

*Першакурсніца Інстытута журналістыкі БДУ па просьбе рэдакцыі вядзе дзённік, куды запісвае свае ўражанні ад новага жыцця пасля паступлення.*

*З першай часткі («ЧЗ» ад 13 лістапада мінулага года) мы даведаліся пра велізарнае жаданне дзяўчыны вучыцца, добрыя стасункі з суседкамі па інтэрнацкім пакоі і пра новых сяброў-аднакурснікаў. У другой частцы («ЧЗ» ад 24 снежня) заўважаем, як на змену гэтай захопленасці неяк пакрысе прыходзіць разуменне: наперадзе — першая сесія. Вучоба робіцца больш напружанай. Каця ўсё часцей ужывае словы «сон», «стомленасць»... У гэты час яна пераязджае ў новы інтэрнат, якім вельмі задаволена. Адна няўдача: няма суседак па пакоі. Сустрэць іх аднойчы пасля вучобы дзяўчына марыць з дня ў дзень. І нарэшце тыя з'яўляюцца: дзве кітаянкі, якія не разумеюць ні рускай, ні англійскай моў...*

*Як прайшла першая сесія, як складваюцца стасункі з новымі суседкамі па інтэрнаце і чаму Кацярыне зноў патрэбна часова змяняць месца жыхарства... Пра ўсё гэта і шмат іншага — у трэцяй частцы «Дзённіка першакурсніцы». Слова аўтарцы.*

SEX-БАЛЯСЫ

# БАРАДА «РУЛІЦЬ»!*

**Сустрэў тут знаёмага і неяк — слова за слова — сама сабой узнікла чарговая тэма «Балясаў». Справа ў тым, што знаёмы гэты носіць бараду. Але часам — з нагоды ці без — знішчае расліннасць на твары, каб праз нейкі час зноў пачаць адпускаць яе «на волю». Кажу яму, што чуў пра адкрыццё ў Мінску спецыяльнага салона для барадачоў. «Гэта што, — тут жа перахапіў ён ініцыятыву. — У Амерыцы цяпер сапраўдны бум сярод маладых людзей на бароды. Прычым у стылі вядомай групы ZZ Top (хто не ведае — гаворка пра трох здаравякоў з даўжэзнымі барадамі, якія выконваюць, дарэчы, песні не вельмі сур'ёзнага зместу, прасякнутыя гумарам і сексуальнымі намёкамі). Для тых, у каго барада не расце, нават паслуга новая з'явілася — па нарошчванні». Свой палкі спіч знаёмы скончыў ледзьве не радасным воклічам: «Цяпер мы «гэтых», гладка паголеных, адцення аднаго вядомага колеру... Пасунем!»**

Ну, наконт «гэтых» таварыш пагарачыўся. Яны нам не канкурэнты ды і, спадзяюся, не так шмат іх у нас. Што мне сапраўды не вельмі падабаецца, дык гэта павелічэнне колькасці хіпстараў — прадстаўнікоў маладзёжнай субкультуры. Тыповы партрэт хлопца-хіпстара: вузкія штонікі, прыталеная куртка ці кашуля, на нагах кеды, у руках сумка кшталту дамскай. І... барада. Ну, не стыкуецца тут нешта... Я такіх называю «барадатымі хлопчыкамі» — як герояў «Казкі аб страчаным часе». А яшчэ — памятаеце жарт з КВЗ? «12-гадовы чачэнскі хлопчык, стоячы на прыпынку грамадскага транспарту, падрапаў сваім шчаціннем аўтобус, які праехаў побач».

...Сёння барада — гэта модна. Яна надае сексуальнасці, імпазантнасці. Можа, хто з цяперашняй моладзі і не ведае, але яшчэ параўнальна нядаўна яе нашэнне маладымі людзьмі не вельмі віталася з боку навакольных. Колькі часу таму гэта дазвалялі сабе хіба што журналісты, мастакі ды будучыя святары. Як прыгадаў той жа знаёмы, «калі стаяў вось тут, дзе мы зараз — каля Дома прэсы, гэта было нармальна. Вядома, творчыя асобы! А дадому да бацькоў прыедзеш, ва ўсіх пытанне: чаму выглядаеш, як асоба без пэўнага месца жыхарства?» Дзіўна, праўда? Асабліва калі ўлічыць, што тыя самыя навакольныя кожны вечар чулі, можна сказаць, гімн гэтаму атрыбуту мужчынскай знешнасці. «Хто я? Дзед Барадзед. Абышоў белы свет і цяпер у ціхі час завітаў да вас!» — вітаў усіх з тэлеэкрана герой «Калыханкі».




Барада — гэта не проста расліннасць на твары. Што тады? Я думаю, што колькі людзей, столькі будзе і поглядаў. Для некага — стан душы, светапогляд. Хтосьці ўбачыць у ёй пацвярджэнне брутальнасці, а іншы — творчы пачатак. Вы ведаеце, колькі ёсць жартаў на гэтую тэму? Загінайце пальцы! «Барада ўсё сцерпіць», «Барады няма — лічы, калека», «Дзве барады — пара», «Будзе і на нашай вуліцы барада», «Барада — другое шчасце», «Трымай бараду па ветры», «Барада ў дапамогу», «Барада слязам не верыць», «Барада — не дурніца», «Справа пахне барадой» і, нарэшце, «Барада — усяму галава». Можна яшчэ дадаць вядомае, што яна саграваe ў халады — замест шаліка. Дарэчы, ведаеце, што ёсць два віды нашэння барады — летні і зімовы?

**Барада прыцягвае ўвагу ўсіх дзяцей, цікавіць многіх жанчын. Першыя цягнуць ручкі, каб памацаць яе, патузаць. Другія, па вялікім рахунку, робяць тое ж самае...**

...Адзін будзе ставіцца да расліннасці на твары па-філасофску (кшталту як да курэння трубкі, якое не церпіць паспешлівасці). А другі нават галаву сабе не будзе забіваць: расце — і расце. Форма і памер для некага — своеасаблівы культ, а для іншага нават думкі пра тое — піжонства. Напрыклад, вы чулі пра стадыі росту барады — як мужчына відазмяняецца пры пэўнай яе даўжыні? «1. Сексі. 2. Тыдзень у запоі. 3. Марскі капітан. 4. Ваеннапалонны. 5. Асоба баз пэўнага месца жыхарства. 6. Чараўнік». Што безумоўна даказвае гэты пералік? Што людзі з барoдамі — з гумарам.

...Я мог бы сказаць, што барада сведчыць пра сталенне мужчыны: пакуль яна аднаго колеру, ты ўспрымаеш свет гэтак жа, без кампрамісаў — або белае, або чорнае. Чым больш у ёй з'яўляецца сівых валасоў, тым хутчэй прыходзіць разуменне, што свет — ён і з паўтонаў таксама... І сам сябе мог бы абвергнуць, сказаўшы, што пачатак вядомага ўсім выслоўя пра «сівізну ў бараду» неабавязкова павінен заканчвацца «чортам у рабро». Часам гэты сівы волас можа стаць пачаткам новага жыцця, сведкам рэалізацыі нейкай даўняй мары, кардынальных змен.

Барада прыцягвае ўвагу ўсіх дзяцей, цікавіць многіх жанчын і выклікае часам не вельмі пазітыўныя эмоцыі ў некаторых мужчын. Першыя, пра каго згадаў, нават крыху спужаўшыся напачатку, потым, як правіла, цягнуць ручкі, каб памацаць яе, патузаць — ці мяккая. Другія, прадстаўніцы чароўнага полу, па вялікім рахунку, робяць тое ж самае... Адзінае — прапускаючы стадыю перапуду. Трэція дзеляцца на тры катэгорыі. Ёсць мужчыны, у якіх барада не расце ўвогуле. Ёсць тыя, каму яна не пасуе, нават калі расце. І ёсць проста мужчыны з барадой. З якога боку можа ісці негатыў, думаю, здагадаліся. Яшчэ адзін знаёмы барадач расказваў пра свайго аднагрупніка. Той, калі ў спрэчцы заканчваліся ўсе аргументы, нязменна кідаў напрыканцы: «Пагаліся!» Пасягаў на святое...

...Закончыць хацелася б «барадатым» анекдотам у тэму. Адзін чалавек вынайшаў прыбор для галення. Дэманструе яго: «Вось сюды трэба ўставіць галаву — і аўтаматыка ўсё зробіць». Яму кажуць: «Дык авал твару ў кожнага свой». «Гэта толькі да першага галення!..» Дык вось добра, што і твары, і мы самі — розныя. А некаторыя — яшчэ і з барадой.

** Гэты матэрыял быў напісаны задоўга да фіналу «Еўрабачання» і ніякага дачынення да яго вынікаў — «барадатага твару Еўропы» — не мае.*

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «УСЯГО Ў ЖЫЦЦІ ХАЧУ ДАБІЦЦА ДЗЯКУЮЧЫ МУЗЫЦЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**— Вы вучыліся ў музычнай школе па класе баяна, потым з'явілася захапленне гітарай. А ці хапала часу, каб пабегаць з хлопцамі ў двары?**

— Дваровае баўленне часу мяне мінула. Эмоцый мне і без таго хапала. Ганяць мяч ці проста ладзіць тусоўкі ў дварах — абсалютна не пра мяне. Часам хацелася быць з кімсьці на агульнай хвалі. Але тое хутка змянілася, з'явілася сяброўская кампанія, і з ёй я да пераезду ў Мінск пастаянна праводзіў час. Мы разам хадзілі на канцэрты, ладзілі сабе нейкія вечарынкі...

**— Па адукацыі вы архітэктар-дызайнер... Гэта было жаданне бацькоў?**

— У пэўным сэнсе так, але з іншага боку, калі б я сказаў «не хачу», то ніхто б мяне не прымушаў. Усё адбылося, хутчэй, само сабой, без асаблівых ваганняў. Я скончыў мастацка-архітэктурны ліцэй, а там цябе мэтанакіравана рыхтуюць да паступлення на архітэктурны факультэт БНТУ. Зрэшты, мне заўсёды хацелася займацца музыкай. І я ніколі не пераставаў ёй займацца.

**— Музыка для вас — захапленне ці прафесія?**

— Цяпер я намагаюся ўспрымаць яе як прафесію. Гэта цяжка, складана: і пастаянны недахоп фінансаў, і туманныя перспектывы. Але пакуль жыццё складваецца так, што я маю магчымасць займацца ёю на прафесійным узроўні. І я жыву сваёй страсцю, марай.

**— Але ў вас была думка закрыць BosaeSonca...**

— Калі мы запісалі альбом «Адпусці» і я ўжо ведаў, што еду ў Маскву працаваць з гуртом Fridance, то думаў, што гэта будзе прыгожая кропка — мы выдаём альбом, ладзім фінальны канцэрт і развітваемся. Але жыццё вырашыла за нас інакш. Усё атрымала працяг. Альбом заўважылі, колькасць прыхільнікаў павялічылася, нават нягледзячы на тое, што мы не знаходзімся цяпер увесь час у Мінску. Хаця гэта абсалютна зразумела, бо раней проста не было відаць вынікаў нашай працы: мы не выдавалі альбомаў, не рабілі ніякіх сур'ёзных крокаў па менеджменце, па прасоўванні сябе, а са з'яўленнем першага, потым і другога альбомаў, аўдыторыя пачала заўважаць, што ёсць такі гурт. Пачалі хадзіць на нашы канцэрты. Таму пакуль у гісторыі гурта BosaeSonca ставім шматкроп'е. На сёння ён — інстанцыя, якая існуе не сама па сабе, а ў вельмі цеснай узаемасувязі са сваім слухачом. Пакуль адчуваем патрэбу ў нашым існаванні з боку слухачоў, мы будзем працаваць.

**— Творчасць беларускамоўных музычных калектываў нехта ўспрымае як даніну модзе, іншыя — як пазіцыю пратэсту. А насамрэч, што ж рухае музыкантамі?**

— Для мяне, як я казаў, гэта натуральна. Як адбываецца тое ў астатніх, не ведаю. Мяне радуе, што апошнім часам беларуская мова з мовы палітыкаў і апазіцыянераў ператварылася ў мову моладзі і інтэлігенцыі. Гэта грамадская культурніцкая з'ява. Так і павінна быць. Я, калі толькі пачынаў спяваць па-беларуску, заўсёды хацеў, каб наша творчасць не ўспрымалася як нейкая палітычная пазіцыя. Цудоўна, што цяпер так адбываецца.

**Хочацца, каб з дапамогай музыкі атрымалася пабудаваць дом і вырасціць сына. З дрэвам усё прасцей. Калі глядзець на сітуацыю вобразна, музыка і ёсць тое самае дрэва. Яго ты пакідаеш пасля сябе ў свеце.**

**— Ці дазваляе вам музыка камфортна сябе адчуваць у фінансавым плане?**

— Даводзіцца шукаць варыянты падзарабіць. Займацца толькі музыкай у Беларусі могуць дазволіць сабе адзінкі. Калі мы кажам пра папулярную музыку, пра артыстаў, якія існуюць самі па сабе. А, да прыкладу, класічныя музыкі могуць пайсці на працу ў аркестр і там сітуацыя ўжо дае большую стабільнасць. Музыкам кшталту нашага гурта ў фінансавым плане складана не сумяшчаць творчасць больш ні з чым. Я вельмі засяроджаны толькі на музычных справах і паралельную хвалю пакуль лаўлю. Спрабаваў займацца журналістыкай, працаваў на радыё. Цяпер спрабую сябе ў фатаграфіі і ў выяўленчым мастацтве, бо ў мяне ўсё ж такі і адукацыя ёсць. У любым разе варта правільна расстаўляць прыярытэты і не сыходзіць у «зорны свет», маўляў, буду займацца толькі музыкай і ўсё. Як любы нармальны музыка я спадзяюся, што так яно і будзе ў пэўны момант, але да таго дня, як кажуць, мусіш круціцца.

**— Ёсць меркаванне, што мужчына павінен пабудаваць дом, вырасціць сына і пасадзіць дрэва... А якое месца адводзіцца музыцы?**

— Калі мы кажам, што асоба павінна штосьці зрабіць у сваім жыцці, то ў маім выпадку я хацеў бы дасягнуць усяго, займаючыся музыкай. Мая звышзадача ў гэтым. Хочацца, каб з дапамогай музыкі атрымалася пабудаваць дом і вырасціць сына. З дрэвам усё прасцей. Калі глядзець на сітуацыю вобразна, музыка і ёсць тое самае дрэва. Яго ты пакідаеш пасля сябе ў свеце.

**Алена ДРАПКО.**

## ДАВЕДКА «ЧЗ»

**Беларускамоўны рок-калектыў BosaeSonca створаны ў 2006 годзе Алесем Катом-Зайцавым, які з'яўляецца лідарам групы, і яго аднакурсніцай, скрыпачкай Сашай Баброўнік. У пэўнай меры BosaeSonca цяпер можна лічыць міжнародным праектам: баяніст Аляксандр Ясінскі жыве ў Празе, а сам Алесь — у Маскве. Летась у гурта выйшлі два сольныя альбомы — у электронным стылі (альбом «Залаты») і ў акустычным гучанні (альбом «Адпусці»).**

**З ВОДГУКАЎ НА АЛЬБОМ «АДПУСЦІ» НА ПАРТАЛЕ EXPERTY.BY:**

**Сяргей ФІЛІМОНАЎ, тэлевядучы:** «Прадукт высокай якасці, які смела можна паставіць побач са знакамітымі камандамі сусветнага ўзроўню... Можна цешыцца з патрыятычнай нагоды (што гурт — наш), а таксама шкадаваць з агульнай (што гурт — наш). Спявалі б на англійскай, жылі на Туманным Альбіёне, дык прадавалі б свае запісы мільённымі накладамі. Гэткі жанр мае не аглушальную, але трывалую колькасць прыхільнікаў ва ўсім свеце. Шчыра кажучы, я быў здзіўлены і захоплены альбомам «Адпусці» «БосагаСонца».

**Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ, музычны журналіст:** «Цёплая, пранікнёная, шчырая праца, якая не лупцуе цябе эмоцыямі, а, наадварот, — як той павучок, ціха і ласкава аплятае імі слухача».

**Алег КЛІМАЎ, музычны аглядальнік:** «Галоўная заслуга гурта ў тым, што ён бярэ не паасобку хітамі (якіх, па сутнасці, як я іх уяўляю, няма), а ўсёй сваёй творчасцю ў цэлым — негалоснай, мяккай, інтэлігентнай, прыгожай».

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар-галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.836.
Нумар падпісаны ў 19.30 14.05.2014 г.

## Літаратурныя практыкаванні

Аляксандр ГОРБАЧ

# ВЫПАДАК НА РЫБАЛЦЫ

ГЭТЫ дзень з самага ранку не прадвяшчаў нічога добрага. Вельмі ўжо напышліва для позняга лістапада ззяла сонца, якое, нібы жоўты сігнал святлафора, выкацілася над магістраллю, вельмі ўжо часта перабягалі дарогу з пустымі вёдрамі грыбнікі, калі я са сваім новым сябрам Генам (пазнаёміліся некалькі тыдняў таму) ехаў рыбачыць з райцэнтра на невялічкае маляўнічае возера каля «алімпійкі»... Павярнулі ў лес, праз 200 метраў «спешыліся» на палянцы перад прыгоркам. За прыгоркам, унізе, — авал возера. Рыбакоў няманога — і гэта радуе.

Па «маім» месцы нібы начная оргія пракацілася: раскіданы нейкія сурвэткі і іншая драбяза; вострыя жаночыя абцасікі бязлітасна ўтапталі ўсё гэта ў сыры пясочак; на голай галінцы прыбярэжнага хмызняку боўтаецца жоўтая гумка для валасоў... Вочы мае б усяго гэтага не бачылі! Што тут адбывалася ноччу?.. Але расклаў снасці, закінуў вуды.

Гена размясціўся за кустом справа.

Увесь час, пакуль рыбачыў, не даваў спакою аранжавы пакет, які ляжаў пад кустом за два-тры метры ад нас. Ён так і прыцягваў погляд: зусім не падобны на «смеццевы»! І калі рыбалка падыходзіла да завяршэння, падняў яго, разгарнуў — і ахнуў: партаманет і... грошы! Прычым усе гэтыя 600 еўра ляжалі не ў партаманеце, а стосікам побач...

На плячо лягла цяжкая рука. Аж уздрыгнуў ад нечаканасці. Азіраюся: Гена... Уф-ф!

— Ну, што? Давай дзяліцца! — з'едліва ўсміхаючыся і прагна дыхаючы, гаворыць Гена. — Я гэты пакет яшчэ раніцай заўважыў, калі ты нават вуды не расклаў.

— З якой такой прычыны? Ты — дзяржава, з якой я павінен дзяліцца, калі знайшоў скарб?

— І ўсё ж такі думаю, што табе прыйдзецца падзяліцца, — прашыпеў скрозь зубы Гена, і я адчуваю, як яго кручкаватыя пальцы лёгка сцягваюць у камяк куртку на плячы.

— Гена, адвалі! — пракрычаў у яго азвярэлы, наліты крывёй твар, ледзь-ледзь сарваўшы з пляча яго «бетонную» руку.

— Саня!.. Ты ведаеш! Я сваім нажом умею добра... не толькі сала рэзаць, — працэдзіў Гена і, сціснуўшы кулакі, марудна пабрыў да сваіх снасцяў.

...Цішыня над возерам. Маўчым. Гм... Вось і новы сябар... Але гэта ж пагроза! Парэжа, нібы сала... Цясак у яго здаравенны — я адразу заўважыў. Калочкі пад вудзільна рэжа вельмі лоўка... Думкі не аб рыбалцы, дый няма клёву. Нейкая трывога на душы.

— Гена, забудзем! Паехалі дадому: праз гадзіну сцямнее. Што сядзець?

Маўчанне ў адказ. Збіраю снасці, аранжавы пакет з грашыма — у рукзак.

— Я табе ўсё сказаў! — кідае мне ў спіну Гена. — Пакуль будзь здароў! Пасля пагаворым! Хутка пагаворым.

Плятуся на ўзгорак да аўтамабіля. Забродныя боты грузнуць у пяску, у галаве кавардак... Я не ведаў яго зверскай натуры, хаця, кажуць, гэты Гена ў начную змену на заводзе збіў кагосьці ледзь не да смерці, але апраўдаўся: маўляў, нецвярозы быў той, зняважыў іх, сам чапляўся. Хаця, наколькі ведаю, той малады чалавек — інтэлігент... Ёсць над чым задумацца.

Снасці — у багажнік, рукзак — на пярэдняе сядзенне. Але чаго ты, мілая «рэношка», так нахілілася? Ёлкі-палкі: кола прабіта... Гена? Як быццам, не. Хаця... Ён адзін раз, адразу пасля нашай спрэчкі, хадзіў у гэты бок... Нікуды не дзецца: дамкрат, ключ, запаска...

Раптам побач бразнулі дзверкі аўто. Ускідваю вочы: за восем-дзесяць метраў спыніўся чорны джып «БМВ». Клюшняногі шыракаплечы здаравяк з паходкай дзюдаіста абходзіць аўто, адкрывае дзверцы, сярдзіта вырывае з салона даўганогую рыжавалосую дзяўчыну.

— Ігар ведаў! Лёлік ведаў! Кожная паршывая авечка ведала пра гэтыя 600 еўра! Але трэба, каб Віталь!.. — дзіка крычыць ёй у твар. — Кожны, хто скажа...

Ён асёкся — убачыў мяне. Пакуль я, стоячы на карачках, калупаюся з прабітым колам, ён падыходзіць, трымаючы за руку гэтую рыжую... Гм, а дзяўчына не проста сімпатычная — раскошная прыгажуня! Як моцна хваляюцца гэтыя калыханні сцёгнаў і пышнага бюста... Але агульнае ўражанне крыху псуюць вочы — ці то п'яныя, ці то вінаватыя.

— Што тут у цябе? Рамонт? — цікавіцца трохі разгублена ў мяне клюшняногі. Погляд яго слізнуў на мае забродныя рыбацкія боты, а вочы рэзка звузіліся. — Рыбачыў тут?

— Рыбачыў, — адказаў я і сам быў уражаны тым, наколькі слабым і спалоханым аказаўся мой голас.

— А ты... Пакет аранжавы... Хаця лады: вас тут, напэўна, як сабак нярэзаных. Пачасалі, лахушка!

Ідуць на прыгорак, вострыя абцасікі рыжай прыгажуні глыбока паглыбляюцца ў жоўты пясок; клюшняногі, які на галаву ніжэй за сваю спадарожніцу, трымае яе за запясце. Зніклі за прыгоркам; ім да возера і месца лоўлі — прыкладна 150 метраў... Мае рукі калоцяцца, нібы ў канвульсіях. Заўважаю: з «БМВ» за мной сочыць нейкі мамбіза ў чорных акулярах. Пад яго канвойным поглядам яшчэ мацней прабіваюць дрыжыкі. Не памятаю, як і прыладзіў гэтае праклятае кола.

...Аўто завялося лёгка, хваля шчасця накаціла, нібы цунамі. Божа! Я жывы! Я свабодны! Яшчэ хвіліна — і мяне не знайсці: ці мала рыбакоў тут перабывала за дзень? Выварочваю рулявое кола, праязджаю міма «БМВ»; бамбіза, калупаючыся ў роце зубачысткай, ляніва праводзіць мяне вачыма ўслед.

Уф! «Алімпійка»! Як я люблю цябе, родная магістраль! Ды я ўвогуле цяпер нікога не баюся! Праўда, хуткасці дадаў. Не хвалюйся, Саня. Твая крэйсерская — 90 км\гадз. Супакойся. Тут да роднага райцэнтра — 20 кіламетраў. Не болей.

Заспяваў тэлефон. Жонка. Бяру мабільнік, слухаю мілы родны голас. Эх, дарагая! Калі б ведала ты, у які пераплёт я патрапіў сёння! Агарод цесця? Градка часнаку? Гэта смешна... Ой! Што гэта за блікі ў люстэрку?

У галаву ўдарыла кроў, перахапіла дыханне: «прыстроіўся» і спакойна рухаецца чорны джып.

Той самы...

Так, клюшняногі дзюдаіст за рулём, я яго пазнаў. Погляд спакойны, нават раўнадушны — быццам перад ім талерка супу, а не «Рэно». Але хто побач?.. Не, гэта не рыжавалосая прыгажуня. І тут з жахам для сябе пазнаю, што на пярэднім сядзенні, з'едліва ўсміхаючыся, сядзіць... Гена.

Ад страху пахаладзела патыліца...

❍ ❍ ❍

Ступар. Прастрацыя. Ватныя ногі, ватныя рукі. Нямое кіно; за рулём зомбі — бледны, са спацелым тварам аўтар гэтых радкоў.

Ззаду — джып.

Аблажылі!.. У міліцыю не патэлефануеш. Грошы насамрэч тупа ўкраў, сволач! Рукзак на пярэднім сядзенні — прамы доказ. Чаго было сунуцца 90 км у гадзіну, лох нікчэмны! Мог бы і 130... ужо быў бы дома. Хаця... Гена. Спыніцца, вярнуць грошы? Але фізічная расправа гарантуецца... Прапаноўваў жа летам піцэрскі пляменнік «траўматыку» — можа, адбіўся б?

Правай рукой выцягваю з рукзака аранжавы пакет, разварочваю, дастаю 600 еўра — і кладу ў бардачок. Пакет з партаманетам — на сядзенне. У гэты момант мабільнік наліваецца святлом, з'яўляюцца нейкія чатыры літары. Гляджу — і нічога не магу зразумець. Тыя літары — «Гена». Слухаю:

— Саня, ты дарэмна тэлефанаваў у міліцыю. Мы ўсё бачылі. Лепш вярні грошы — мінчане цябе не крануць.

Чуецца корпанне — і другі рэзкі металічны голас чалавека, які, відаць, вырваў мабільнік з рук Гены:

— Слухай, ты, лох недабіты! Даю табе 100 метраў на тармазны шлях — пакуль я не закапаў цябе ў гэтых тваіх грэбаных Лапацэвічах, або як яны тут называюцца! Без казлоў і лялек гавару!!! Замаўчы, авечка (відаць, рыжай прыгажуні), — распілую на часткі, калі бабкі застануцца ў гэтага чмыра...

— Лаві! — крычу ў трубку і шпурляю пусты аранжавы пакет у акно — на абочыну.

Джып рэзка тармозіць, я дадаю газу. Да роднага горада — пара кіламетраў. Але... дадому нельга. Гена ўсё пакажа. А чорт! І гэтае бяздомнае «шчасце» каштуе 600 еўра? Эх, лепш драмаў бы цяпер перад тэлевізарам — вось яно шчасце!.. Што рабіць? Імчаць да Сяргея, да сябра? Не зразумее мяне, Сяргей Анатольевіч, хаця... што застаецца?

Бандыты з джыпа ў той вечар пабывалі ў пад'ездзе маёй шматпавярхоўкі. Суседзі гаварылі, што прыходзілі нейкія хуліганы, званілі і нават білі нагамі ў металічныя дзверы. Але дома нікога: жонка з дачкой у цесця. Пасля джып накіраваўся ў РАУС. Я ведаю гэта, ведаю... Куды ж вы без міліцыі? Чакаў у двары суседняй шматпавярхоўкі і бачыў, як, раслапырыўшы пальцы і жэстыкулюючы, у райаддзел зайшоў клюшняногі, за ім — Гена. Апошнім ішоў той бамбіза ў цёмных акулярах — здаравенны, нібы бык-бугай.

Я хутка выйшаў з машыны, падышоў да джыпа. Рыжавалосая прыгажуня свабодна сядзела на заднім сядзенні. Гм... Такіх раскошных дзяўчат-жанчын у нашым райцэнтры дакладна няма. Пастукаў у дзверцы — марудна і плаўна апусцілася шкло.

— Вазьміце, прыгажуня, — падаў ёй у акенца 600 еўра. Яна, ціха ўсміхаючыся вачыма, працягнула руку, гледзячы не на грошы, а на мяне.

— Тыя самыя еўра? — спытала ледзь-ледзь усміхаючыся.

— Тыя самыя... Ды пералічыце ў рэшце рэшт! І патэлефануйце вашым арлам, скажыце: грошы вярнулі, міліцыя адпадае. Бо не паздаровіцца ні мне, ні ім. Усяго добрага!.. І яшчэ. Ваш сябра мяне абазваў па тэлефоне, так бы мовіць, нетрадыцыйным — гэта не так! Мне дзяўчаты падабаюцца! Асабліва такія мілыя, рыжанькія і сімпатычныя, — не ўтрымаўся, каб не ўставіць у сваю гутарку камплімент, і, спустошаны і злосны, пабрыў да машыны...

❍ ❍ ❍

Праз два дні жонка пытаецца:

— Не разумею, чым вы займаецеся на рыбалцы? У вас там рыцарскія турніры?.. Гена вунь з такім вялізным фінгалам ехаў з работы на веласіпедзе, што я ледзь не самлела, калі яго ўбачыла такім размаляваным... Кажуць, нейкія рыбакі збілі на возеры. У вас здараюцца бойкі з-за гэтых дробных плотачак і печкуроў? Ненармальныя! Я заўсёды гаварыла...

— Які Гена? Які фінгал? Не ведаю ніякага фінгала!

Высветлілася наступнае: там, каля райаддзела міліцыі, Гена стаў патрабаваць сваю частку ад атрыманых 600 еўра. Мінчане намякнулі: такія справы робяцца дакладна не каля дзвярэй райаддзела міліцыі; прапанавалі сесці ў джып, адвезлі назад на бераг возера і моцна збілі. Відаць, невыносна свярбелі кулакі ў клюшняногага і яго здаравеннага сябра-бугая.

Застаўся Гена адзін каля самага сіняга возера.

...Не спытаў: ці не валялася побач з ім разбітае карыта?

## Экслібрыс «Звязды»

# КАЛОДЗЕЖ СІМВАЛАЎ І СЭНСАЎ

**Існуе меркаванне, што ў сучаснай беларускай літаратуры надзвычай мала празаічных твораў, за чытаннем якіх можна прабавіць час у дарозе ці на вакзале, якія здольны захапіць увагу не толькі інтэлектуалаў-прафесіяналаў ад літаратуры, але і шараговага жыхара нашай краіны. Маўляў, пасля Івана Шамякіна ніхто з суайчыннікаў так добра і захапляльна не пісаў пра свой час. Трымаючы ў руках новую кнігу прозы Андрэя Федарэнкі «Ціша», што зусім нядаўна выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», магу смела паспрачацца з такім «пастулатам».**




Гэтага аўтара называюць нашым сучасным класікам. Думаецца, не выпадкова. Няспешны ход падзей, разважлівы голас пісьменніка, пазіцыя «нароўні» з чытачом ужо многа гадоў прываблліваюць і нібыта падкупляюць аўдыторыю ўдаванай простасцю твораў. Вось і свежая кніга аповесцяў і апавяданняў працягвае гэтую традыцыю. Пад яе вокладкай — два новыя вялікія аповеды «Ціша» і «Дзядзька Адольф», а таксама шэраг апавяданняў, якія былі напісаны аўтарам у розныя гады. Кожны з іх, з аднаго боку, проста цікавая гісторыя-замалёўка з жыцця. З іншага, глыбокі калодзеж сімвалаў і сэнсаў.

Да прыкладу, аповесць «Дзядзька Адольф», дзе распавядаецца пра простага беларуса Адольфа, які працуе мастаком-афарміцелем на звычайным мясцовым камбінаце. Але перажывае Адольф складаны для кожнага мужчыны перыяд, які псіхолагі называюць «крызісам сярэдняга ўзросту». Яму надакучвае праца, пачынае раздражняць жонка-сірата Ірына, з якой ён пражыў усё жыццё, не прыносяць радасці мастакоўскія эксперыменты на прыродзе — «акварэлькі», ды яшчэ і сын ідзе ў войска, а дачка, ужо цяжарная, адразу пасля заканчэння школы выходзіць замуж за азербайджанца. Крызіс ды і толькі.

Што рабіць? Заліваць роспач гарэлкай? Менавіта гэта і робіць Адольф, калі яго скарачаюць з працы. А потым — інфаркт, нечаканы развод, паездка ў санаторый. Выпадковае знаёмства з новай жанчынай, пераезд у Мінск, падарожжа ў Парыж, новая праца, атрыманне правоў і машына... Пагадзіцеся, у жыцці бываюць і не такія складаныя гісторыі, вострыя сітуацыі і паламаныя лёсы. Шкада толькі, што аўтар, звяртаючы асноўную ўвагу на вобраз Адольфа, зусім не распавядае пра Ірыну. Як яна жыла, калі былы муж, але яшчэ блізкі чалавек, бавіў час у санаторыі? Чакала? Вядома, бо ён павінен вярнуцца. Пакутавала ад адзіноты, пакінутая і мужам, і дзецьмі? Напэўна. Як перажыла расстанне і ці знайшла новага каханага? Можа, аўтар проста не ведае, што адбываецца ў душы жанчыны ў такія моманты ці проста тактоўна пакідае Ірыну сам-насам са сваімі думкамі, слязьмі, пакутамі і перажываннямі? Затое дае нагоду для абмеркавання. Асабліва ў кампаніі жанчын — аматарак прозы.

Уражвае глыбінёй аўтарскіх разваг і загалоўная аповесць з сімвалічнай назвай «Ціша». Ціша — не толькі цішыня, што пануе ў маленькім, амаль дачным мястэчку Чэшская Слабада, якое вось-вось «праглыне» горад, але і мянушка сабачкі — самай важнай істоты ў жыцці аднаго з герояў. Пісьменнік тым самым падкрэслівае, што людзі могуць быць надзвычай дробязнымі ў сваіх паводзінах і памкненнях. Усё жыццё варагаваць з братамі, забывацца на маці і яе смерць на фоне смерці Брэжнева (яны паміраюць амаль у адзін і той жа час) успрымаць як нешта другаснае. Адметна, што падзеі аповесці чытач бачыць вачыма хлопчыка Петрыка, які толькі пачынае хадзіць у школу.

Менавіта Петрык выступае тут у якасці маральнага камертона. Ён перажывае за бабулю Домну, маці, бацьку, мае параўнальна добрыя адносіны з дзядзькамі, якія ўсё жыццё нешта дзеляць і ніяк не могуць прымірыцца. Важна, што ў школе хлопчык знаходзіць сабе добрага сябра і настаўніка па жыцці — суседа дзядзькі Леаніда Міхайлавіча Стаха. Менавіта ён распавядае Петрыку, як важна многа чытаць, тлумачыць некаторыя негалосныя правілы суіснавання ў свеце дарослых.

Думаю, не памылюся, паставіўшы аповесць «Ціша» ў адзін шэраг з творам гэтага ж жанру «Дзяцінства», які напісаў Іван Навуменка. Спадзяюся, Андрэй Федарэнка, па прыкладзе яго старэйшага калегі, напіша працяг гісторыі Петрыка і пазнаёміць чытачоў з новымі падзеямі яго жыцця. Цікава ж!

**Марына ВЕСЯЛУХА**

## Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж»,

**расположенное по адресу: г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8, тел.: 02133 60273; 02133 38338**

## ОБЪЯВЛЯЕТ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

**Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются:** Открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж», г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8.

**Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о приобретении:** для аннулирования и последующего уменьшения уставного фонда в целях сокращения их общего количества.

**Категория приобретаемых акций**: простые (обыкновенные) акции.

**Количество приобретаемых акций:** 5 000 штук.

**Цена, по которой приобретаются акции:** 50 000 рублей за одну акцию.

**Срок, форма и порядок оплаты акций:** перечисление денежных средств на расчетный счет акционеров – владельцев акций – в свободные сроки, не ранее тридцати дней и не позднее шести месяцев с момента заключения договора.

**Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций:** г. Новолукомль, Витебская область, Лукомльское шоссе, 8.

**Даты начала и окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций:** с 1 июня 2014 г. по 30 июня 2014 г.

**Даты начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций):** с 1 июля 2014 г. по 30 сентября 2014 года.

Предложение о покупке акций, опубликованное в газете «Звязда» № 79 29 апреля 2014 г., считать недействительным.

УНП 300007839

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 17.06.2014 в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского,19, конференц-зал.**

